Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 147 (5521) ПАНЯДЗЕЛАК 29 ЧЭРВЕНЯ 1936 г. Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Палітычную аснову СССР складаюць Советы дэпутатаў працоўных, вырасшыя і ўмацаваўшыеся ў рэзультаце звяржэння ўлады памешчыкаў і капіталістаў і заваявання дыктатуры пролетарыята.

(З праекту Канстытуцыі Саюза ССР)

У ІНТАРЭСАХ УСЯГО НАРОДУ

Адзін процант уласнікаў скандэнтроўваў у сваіх руках 59 процантаў усяго нацыянальнага багацця Амерыкі.

Менш двух процантаў уласнікаў сканцэнтроўваюць у сваіх руках 64 процанты ўсяго нацыянальнага багацця Англіі.

200 сем'яў капіталістаў уладаюць асноўнымі багацямі Францыі.

Манапалістычны капітал, які ўтрымлівае зверскую ўладу фашызма, аблытвае сваімі шчупальцамі ўсю народную гаспадарку Германіі, атрымліваючы каласальныя прыбыткі на прыкрытай ваенна-магагічнымі лозунгамі бесчалавечай эксплоатацыі працоўных.

Ва ўсіх капіталістычных краінах на долю мільёнаў рабочых і сялян застаецца нязначная частка народнага даходу. Львіную долю ўсіх народных багацця ў прапежніку акружае невялікая кучка эксплоататараў і іх шматлікая паразітычная чэлядзь.

Няма эксплоататарскіх класаў у совецкай краіне: яны знішчаны назаўсёды. Велізарная доля народнага даходу, якая раней ішла на кармленне эксплоататараў і іх шматлікіх прыхлябальнікаў, на кармленне паразітаў, сядзеўшых на шыі працоўнага народу, цяпер ідзе на расшырэнне сацыялістычнай вытворчасці, на павышэнне матэрыяльнага добрабыту совецкага народу.

У сталінскай Канстытуцыі запісана: «Зямля, яе нетры, воды, лясы, заводы, фабрыкі, шахты, рудні, чыгуначны, водны і паветраны транспарт, банкі, сродкі сувязі, арганізаваныя дзяржавай буйныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы (саўгасы, машынатрактарныя станцыі і т. д.), а таксама асноўны жыллёвы фонд у гарадах і прамысловых пунктах з'яўляецца дзяржаўнай уласнасцю, гэта значыць, усенародным здабыткам».

Усе багацці совецкай краіны належаць совецкаму народу і выкарыстоўваюцца ў інтарэсах усяго народу. Совецкі народ — поўнаўладны гаспадар сваёй краіны. Совецкі народ будаваў і будуе сацыялізм на свае ўласныя сродкі.

Наша дзяржава дабілася буйнейшых поспехаў ва ўмацаванні фінансаў, совецкага рубля. Гэта — велізарная справа таму, што моцныя фінансы — адна з асноў нашага будаўніцтва і паляпшэння матэрыяльнага добрабыту працоўных.

Паглядзіце, якімі гіганцкімі крокамі мы ідзем па шляху ўздыму матэрыяльнага добрабыту, жыццёвага ўзроўню і культуры нашай краіны, якія велізарныя сродкі выдаткоўвае ў клопатах аб чалавеку совецкая дзяржава.

У 1935 годзе на выдаткі, звязаныя з клопатамі аб жанчыне, мацеры і дзіцяці (радзільныя дамы, акушэрскія пункты, яслі, малочныя кухні, дзіцячыя сады і т. д.) было асігнавана 875 мільёнаў руб. У 1936 годзе ў адпаведнасці з новым законам аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, расшырэнні сеткі радзільных дамоў, дзіцячых яслей, дзіцячых садоў і т. д. асігнуецца на выдаткі, звязаныя з дапамогай жанчыне, мацеры і дзіцяці 2 мільярды 174 мільёны руб. Дзе, калі, у якой краіне магчыма павелічэнне на працягу **аднаго** года **ўтрая** сродкаў, якія ідуць на дапамогу жанчыне, мацеры і дзіцяці?

На жыллёвае будаўніцтва ў 1936 годзе выдаткоўваецца на мільярд рублёў больш, чым у 1935 годзе.

На выдаткі, звязаныя з клопатамі совецкай дзяржавы аб старых, аб людзях, страціўшых працаздольнасць, выдаткуецца ў 1936 годзе ў два разы больш, чым у 1935 годзе — да трох мільярдаў рублёў.

На выдаткі па народнай асвеце ў 1932 годзе было асігнавана 4 мільярды рублёў, у гэтым годзе адпускаецца звыш 13 мільярдаў рублёў.

Мы маем значнае павышэнне рэальнай заработнай платы. Гэта павышэнне выражаецца не толькі ў павелічэнні фонду рэальнай заработнай платы, але і ў паслядоўным зніжэнні цэн на тавары шырокага спажывання і прадукты. Фонд заработнай платы ў 1936 годзе ў параўнанні з 1935 годам вырас больш, чым на 8 мільярдаў рублёў. Апрача таго зніжэнне цэн на тавары і прадукты за адзін 1935 год дало совецкаму насельніцтву звыш 5 мільярдаў рублёў.

Нядаўна совецкі ўрад прыняў важнае рашэнне аб патаненні крэдыту. Танны крэдыт для заводаў, фабрык, калгасаў, саўгасаў рушыць яшчэ шпарчэй наперад вытворчасць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, дазволіць дабіцца большага зніжэння сабекошту і далейшага павышэння матэрыяльнага ўзроўню працоўных горада і вёскі. Таму натуральна, што мерапрыемствы ўрада па патаненню крэдыту, па ўмацаванню совецкага рубля сустрэлі алабранне і падтрыманне шырокіх працоўных мас.

Аднак да гэтага часу застаецца вельмі высокі процант, які плоціць совецкая дзяржава па ўнутраных пазыках. Гэты процант выражаецца для большасці нашых унутраных пазык у 12—10 проц., а па апошняй пазыцы 8 проц.

Нашы ўнутраныя пазыкі ідуць на ўмацаванне народнай гаспадаркі, на далейшае павышэнне матэрыяльнага ўзроўню працоўных мас. Гэта добра разумеюць працоўныя нашай краіны.

50 мільёнаў трымальнікаў пазыкі ў Совецкім Саюзе разглядаюць свой удзел у пазыцы, як справу гонару і доўгу совецкага грамадзяніна перад сваёй радзімай.

Працоўныя Совецкай Беларусі ўклалі ў масавыя пазыкі звыш 300 мільёнаў рублёў.

Усё часцей пяпер уздымаюцца з асяродкаў працоўных галасы аб неабходнасці звесці да адзінай пазыкі (уніфікаваць) усе выпушчаныя да гэтага часу рознастайныя пазыкі. У кожнай сям'і ёсць аблігацыі розных пазык, за тыражамі якіх цяжка своечасова і ўважліва сачыць. Звядзенне іх да адзінай пазыкі (уніфікацыя) дасць безумоўна, вялікія выгоды працоўным.

Адначасова з гэтым ставіцца працоўнымі пытанне аб зніжэнні процанта па ўнутраных пазыках, аб павелічэнні тэрміна крэдыту дзяржаве.

Зніжэнне процанта па пазыках павінна прывесці да ўмацавання магутнасці совецкай краіны, да далейшага ўздыму матэрыяльнага добрабыту працоўных горада і вёскі.

Бясспрэчна, што зніжэнне процанта па раней выпушчаных пазыках, патаненне і павелічэнне тэрмінаў крэдыту, звядзенне розных пазык да адзінай пазыкі з'яўляецца наспеўшай і неабходнай справай.

Безумоўна, што гэтыя мерапрыемствы сустрэнуць шырокі волгук, бо яны даюць уманзванне магутнасці совецкай краіны і павышэнне матэрыяльнага ўзроўню працоўных горада і вёскі.

Аднаўляецца выплата пенсій і выходных дапамог былым рабочым і служачым КУЧ

Згодна атрыманых ТАСС'ам весткам, 22 чэрвеня дыпламатычны агент Манчжоу-Го Шы Люй-бень наведаў генеральнага консула СССР у Харбіне тав. Славуцкага і паведаміў яму, што ўрадам Манчжоу-Го адпана распараджэнне аб неадкладным аднаўленні спыненай 16 красавіка выплаты выходных дапамог і пенсій совецкім грамадзянам — былым рабочым і служачым КУЧ. (Кітайска-Усходняя чыгунка).

Адначасова Шы Люй-бень уручыў тав. Славуцкаму новы мемарандум па пытанню аб прэтэнзіях розных прыватных асоб да ўрада СССР, адхіленнем якіх, як гэта было прыведзена ў паведамленні ТАСС ад 23 чэрвеня, урад Манчжоу-Го і матыкаваў у свой час спыненне выплаты памянёных пенсій і дапамог. У гэтым мемарандуме манчжурскі ўрад палемізуе з палажэннямі совецкага мемарандума ад 14 сакавіка г. г., у якім былі прыведзены падставы адхілення совецкім урадам указаных прэтэнзій прыватных асоб на суму каля 1.300 тыс. іен. Мемарандум заканчваецца заявай, што калі совецкі ўрад не пакрые манчжурскаму ўраду ўсёй сумы гэтых прэтэнзій на працягу трох месяцаў, то манчжурскі ўрад зробіць адпаведныя ўтрыманні з неаплачанага кошту выкупу КУЧ.

У кампетэнтных маскоўскіх колах расцэньваюць аднаўленне выплаты пенсій і выходных дапамог былым рабочым і служачым КУЧ, як рэзультат прадпрынятага, з прычыны звароту совецкага ўрада, удзеяння японскага ўрада на ўрад Манчжоу-Го Апошняму, як відаць, было ўказана на тое, што спыненне выплаты прыватным совецкім грамадзянам належачых ім сум з-за прэтэнзіі да совецкага ўрада, к таму-ж вельмі спрэчных, з'яўляецца парушэннем не толькі дагавору аб уступцы праў на КУЧ ад 23 сакавіка 1935 года, але і агульна прынятых элементарных норм права.

Вітаючы аднаўленне спыненых плацяжоў былым рабочым і служачым КУЧ, ва ўказаных маскоўскіх колах разам з тым выказваюць здзіўленне па повалу нагрозы манчжурскага ўрада скарапіць падлягаючы яшчэ аплаце кошт выкупу КУЧ з мэтай здаволення нічым не падмацаваных галаслоўных прэтэнзій, у адносінах якіх совецкаму ўраду да гэтага дня не прадстаўлена не толькі абсалютна ніякіх дакументальных даных, але нават простага спісу гэтых прэтэнзій.

У аўтарытэтных маскоўскіх колах выказваюць упэўненасць, што японскі ўрад, як відома, гарантаваўшы своечасовае і дакладнае выкананне ўрадам Манчжоу-Го ўсіх яго абавязацельстваў па выплаце выкупной сумы за КУЧ, яшчэ раз умяшаецца ў гэту справу і не дапусціць новага і яшчэ больш сур'ёзнага парушэння дагавору ад 23 сакавіка 1935 года аб уступцы праў на КУЧ.

На канферэнцыі ў Мантрэ

МАНТРЭ. 26 чэрвеня. Як ужо паведамлялася, на закрытым пасяджэнні 25 чэрвеня скончылася першае чытанне праекта канвенцыі.

З повалу 9 артыкула японскі дэлегат Сато тлумачыў, што заяўленая ім агаворка адносіцца не да права Турцыі прыняць надзвычайныя меры ў выпадку нагрозы вайны, а да пытання аб паведамленні Лігі нацый аб прынятых мерах. Сато лічыць, што дастаткова будзе ўказаць, што Турцыя паведамляе падпісаўшыя канвенцыю дзяржавы, а турэцкі ўрад зможа ўжо па свайму ўгледжанню паставіць пытанне перад Лігай нацый, калі яна таго пажадае.

Французскі і румынскі дэлегаты выказалі сваю прынцыповую згоду з турэцкімі патрабаваннямі.

Старшыня канферэнцыі Брус указаў дэлегату Японіі, што абавязак уведаміць Лігу нацый усёроўна выцякае з той абставіны, што канвенцыя будзе зарэгістравана ў сакратарыяце Лігі нацый. Гэта-ж падкрэсліў і віцэ-старшыня канферэнцыі Політыс, заяўляючы, што немагчыма пазбегнуць некаторых невыгод у сувязі з выхадам Японіі з Лігі.

У рэзультаце далейшага абмену думкамі рэдакцыйнай камісіі даручана знайсці аднаведную формулу, якая задаволіла-б усе дзяржавы як уваходзячыя, так і не ўваходзячыя ў Лігу нацый.

Пасля абрання рэдакцыйнай камісіі старшыня абвясціў перапынак у занятках пленума, адзначыўшы, што заняткі камісій прадаўжаюцца. Пленум Лігі нацый, мабыць, будзе засядаць да 4 ліпеня. Канферэнцыя ў Мантрэ збярэцца 6 ліпеня.

СОВЕЦКАЯ АВІЯЦЫЙНАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ Ў ЛОНДАНЕ

ЛОНДАН. 25 чэрвеня ў Лондан прыбыла совецкая авіяцыйная дэлегацыя, прыляцеўшая на самалёце «АНТ-9». У складзе дэлегацыі: герой Совецкага Саюза лётчык М. Громаў, начальнік штаба ваенна-паветраных сіл РСЧА камкор тав. Лаўраў і інжынер першага ранга тав. Зінеўскі. Совецкая дэлегацыя будзе прысутнічаць на гралыцыйным парадзе ваенна-паветраных сіл Англіі на Хэндонскім аэрадроме і прыме ўдзел у авіяцыйнай выстаўцы, якая арганізуецца таварыствам брытанскіх канструктараў.

ВЫМЫСЛЫ ГАЗЕТЫ «ІЛЮСТРАВАНЫ КУР'ЕР ЦОДЗЕННЫ»

ВАРШАВА, 25 чэрвеня. Газета «Ілюстраваны кур'ер цодзенны» прыводзіць у двух артыкулах багаты «фактычны матэрыял» у пацвярджэнне сваёй інсінуацыі аб ператварэнні Чэхаславакіі ў «ваенную базу СССР» і ў «пэнтр совецкай падрыўной работы супроць суседніх з Чэхаславакіяй дзяржаў», у прыватнасці супроць Польшчы.

«Са зголы чэхаў, заяўляе газета, — на тэрыторыі Чэхаславакіі працуе совецкая шпіёнская арганізацыя, ахапляючая сваім радыусам дзеяння ў ліку іншых дзяржаў Польшчу. Адным з палітычных заданняў гэтай арганізацыі з'яўляецца распаўсюджанне хлуслівай трывогі аб існаванні польска-германскага ваеннага саюза». У такім-жа духу газета піша аб «насаджэнні з Прагі ваяўнічага комунізма» ў Польшчы. Гэтыя вымышленні безумоўна праектаваны «прыяцелямі» Польшчы з Берліна.

УЗБРОЕНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ ГРУПЫ ЭНДЭКАЎ

ВАРШАВА, 26 чэрвеня (БЕЛТА). Увесь друк жвава каментуе ўзброены напад на кватэру мясцовага старасты і паліцэйскі ўчастак у горадзе Мысленіцы (Кракаўскае ваяводства), зроблены шматлікай групай эндэкаў (партыя нацыянал-дэмакратаў, якая з'яўляецца правай апазіцыяй урада) пад кіраўніцтвам старшыні кракаўскай раённай арганізацыі эндэкаў Дабрашынскага. Нападаўшыя забралі каштоўныя рэчы, грошы і вінтоўкі і скрыліся ў прылягаючыя лясы, дзе прадаўжаюць трымацца, адстрэльваючыся ад праследуючай іх паліцыі.

«Газета польска» ўскладае палітычную адказнасць за дзеянні кракаўскіх эндэкаў на партыю нацыянал-дэмакратаў у цэлым.

Газета «Кур'ер поранны» піша. «Не пакідае пяпер сумнення тое, што разгарнуўшаяся тэрарыстычная дзейнасць эндэкаў планава арганізавана».

Сёння ў сейме па повалу падзей у Мысленіцах выступіў прэм'ер Славой-Складкоўскі. Ён абвінаў ад імя ўрада прымяніць суровыя меры не столькі да непасрэдных удзельнікаў тэрарыстычных актаў, колькі да іх натхняцеляў з партыі эндэкаў. «Яшчэ два ўплывовых члена партыі эндэкаў з Кракава, — заявіў прэм'ер, — будуць пасаджаны ў Бярозу-Картускую» (канцэнтрацыйны лагер).



Тав. Блоцкі Міхаіл Ігнацьевіч, старшыня калгаса імя Варашылава, Рычаўскага сельсавета, Тураўскага раёна, удзельнік усесаюзнай нарады перадавікоў ураджайнасці, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга.

Пленум Совета пры наркоме цяжкай прамысловасці

25 чэрвеня адкрыўся другі пленум Совета пры Народным камісары цяжкай прамысловасці СССР. Пленум адкрыў спаткаць бурнымі апладысментамі тав. С. Орджанікідзе. На парадку дня пленума адно пытанне — як выконваюцца рашэнні снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) аб разгортванні стаханаўскага руху.

З 334 членаў Совета — 163 інжынеры; у складзе Совета — лепшыя стаханаўцы: тт. Стаханаў, Дзюканаў, Ізотаў і інш.; 6 акадэмікаў і 9 прафесароў. Палова ўсіх членаў — ордэнаносцы.

Першае пасяджэнне Совета было прысвечана рабоце нафтавай прамысловасці, якая з'яўляецца адной з адсталых галін народнай гаспадаркі.

***

На ранішнім пасяджэнні Совета 26 чэрвеня з грунтоўным і вялікім дакладам аб рабоце вугольнага Данбаса выступіў начальнік данбаскага камбіната тав. **Бажанаў.**

На гэтым-жа пасяджэнні тав. Стаханаў, спатканы апладысментамі, падзяліўся вопытам сваёй работы ў якасці інструктара Калзіевугаля на адным з самых адсталых раней участкаў шахты «Центральная-Ирмино», «Никанор-Запад». За кароткі час работа ўчастка значна выправілася.

Затым выступілі тт. Дзюканаў, Карташоў, Каплан і інш.

***

У канцы вячэрняга пасяджэння Совета 26 чэрвеня выступіў начальнік галоўнага кіраўніцтва металургічнай прамысловасці тав. **Гурэвіч.**

Адной з асноўных задач металургаў у разгортванні стаханаўскага руху, — указаў тав Гурэвіч, — з'яўляецца дасягненне новых вытворчых магутнасцей агрэгатаў. З гэтай задачай лепш за другіх спраўляюцца пакуль доменшчыкі, якія ідуць па-ранейшаму у авангардзе арміі металургаў. Мартэлаўшчыкі не справіліся з задачай, пастаўленай перад імі ў красавіку—лаваць у суткі 50 тыс. тон сталі. У маі і чэрвені тэмпы выплаўкі сталі нават знізіліся.

Тав. Гурэвіч выказаў упэўненасць у тым, што металургія дасягне к канцу бягучага года сярэдне - сутачнай выплаўкі у 55—60 тыс. тон сталі.

Вялікую цікавасць выклікаў даклад дырэктара Чэлябінскага трактарнага завода тав. **Брускіна.**

На ранішнім пасяджэнні 27 чэрвеня выступалі прадстаўнікі машынабудаўніцтва і будаўнічай індустрыі.

ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА ПРЫ НАРКОМЕ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

26 чэрвеня адкрылася першае пасяджэнне Совета пры наркоме харчовай прамысловасці.

У клубе Наркамхарчпрома сабралося каля 130 членаў Совета і шматлікія госці. Сярод членаў совета — каманднзіры буйных прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, дырэктары камбінатаў, трастаў, стаханаўцы - рабочыя, рыбакі, прафесары, навуковыя работнікі, упаўнаважаныя наркамата ў саюзных распубліках. Сярод іх многа ордэнаносцаў: апаратчык цукровага завода імя Калініна тав. Літвіненка, трактарыст Уграедскага буракасоўгаса тав. Радчэнка, звяснявая Падзеральнянскага буракасоўгаса тав. Улот, камбайнер промкамбіната імя Сталіна тав. Сахно і інш.

У кароткім уступным слове нарком харчовай прамысловасці тав. Мікаян ахарактарызаваў задачы, якія стаяць перад Советам. У абвестцы дня адно пытанне: выкананне рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) аб стаханаўскім руху.

— Поспехі харчовай прамысловасці,—гаворыць тав. Мікаян, — несумненны. У гэтым годзе яна 20 чэрвеня, на 10 дзён раней тэрміну, перавыканала поўгадавы план. Але калі ўважліва ўглядзецца ў работу паасобных прадпрыемстваў, то бачым, як многа яшчэ ненармальнасцей і як многа яшчэ нескарыстаных магчымасцей.

На пленуме заслуханы даклады аб рабоце рыбнай, цукровай, спіртаводчай, хлебнай, мясной і кандзітарскай прамысловасці.

Стаханаўцы сенауборкі

КАПАТКЕВІЧЫ, 27 чэрвеня. У калгасе «Чырвоная Арэса» разгарнулася спаборніцтва за права падпісу пісьма таварышу **Сталіну** ад беларускага народу. На сенакашэнні стаханаўскае звяно Ашнуковіча Сапрона выкашвае штодзенна 1,18 га на кожнага касца. Стаханавец Малазян Іван Дзем'янаў 25 чэрвеня скасіў 1,57 га. **УЗІЛЕЎСКІ.**

БЕШАНКОВІЧЫ, 28 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). Калгаснік калгаса «Чырвоная зорка» тав. **Ткачонак Васіль** 27 чэрвеня за дзень скасіў 1,61 гектара сенакосу замест нормы 0,35 гектара, што складае 460 проц. Спаборнічаючы з ім калгаснік **Белаус Кірыл** выкасіў за гэты дзень 1,25 га.

Зарубежны.

АРШАНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛАН СЕНАПАСТАВАК

27 чэрвеня Аршанскі раён закончыў сенапастаўкі дзяржаве, выканаўшы галавы план на 100 процантаў.

Леановіч, Сцяпанаў, Крышкіян.

РЭКОРД КОМСАМОЛЬЦА БУРЖЫМСКАГА

КЛІЧАЎ, 28 чэрвеня. (**Па тэлеграфу**). Калгаснік калгаса «Чырвоны лістапад» комсамолец **Браніслаў Буржымскі** 27 чэрвеня паставіў рэкорд па сенакашэнню, скасіўшы за дзень 2,40 гектара сенажаці.

ГОЛУБ.

Аб стварэнні канстытуцыйнай камісіі для распрацоўкі праекта новага тэкста Канстытуцыі БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР.

Для распрацоўкі праекта Канстытуцыі БССР на падставе апублікаванага праекта новага тэкста Канстытуцыі СССР прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

1. Абрань канстытуцыйную камісію ў складзе:

1. Галадзед М. М. (старшыня).	16. Задзернюк В. І.
2. Гікало Н. Ф.	17. Кудзельскі Р. С.
3. Валковіч Д. І.	18. Каліна І. П.
4. Чарвякоў А. Г.	19. Кудзелька І. Ф.
5. Убаржэвіч І. П.	20. Дзякаў А. І.
6. Булін А. С.	21. Кузьмін П. В.
7. Саакян А. М.	22. Пушчын Ф. Ф.
8. Рыскін А. Б.	23. Жолудаў К. М.
9. Лепляўскі І. М.	24. Свірыдаў З. І.
10. Кавальчук З. З.	25. Дубіна А. В.
11. Сурта І. З.	26. Жуковіч Е. Ф.
12. Стэрнін Н. К.	27. Малашонак Н. С.
13. Бенеш К. Ф.	28. Стакун М. І.
14. Картукоў А. С.	29. Зстрын М. Х.
15. Хадасевіч П. І.	30. Жураўлёў І. Г.
	31. Ляўкоў М. А.

2. Даручыць камісіі перагледзець дзейнічаючы тэкст Канстытуцыі БССР і ўнесці новы тэкст Канстытуцыі на зацвярджэнне Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

26 чэрвеня 1936 года.
г. Менск.

ХОД СЕНАКАШЭННЯ, ПАДНЯЦЦЯ ЦАЛІНЫ, ПАПАРАЎ, АКУЧКІ БУЛЬБЫ, ПРАПОЛКІ ЛЬНА У ДРУГІ РАЗ І СІЛАСАВАННЯ ПА РАЁНАХ БССР НА 25-VI 1936 Г. (У ПРОЦАНТАХ)

№ п. п.	Назва раёну	Скош. нагур. сенаж. па калг. сял. сект.	Паднята калгасамі цаліны	Паднята калг. сялянск. сект.	Прапол. калг. сялянск. сект. ільну у другі раз	Акучана калгасам бульбы	Засіласавана калгасамі	№ п. п.	Назва раёну	Скош. нагур. сенаж. па калг. сял. сект.	Паднята калгасамі цаліны	Паднята калг. сялянск. сект.	Прапол. калг. сялянск. сект. ільну у другі раз	Акучана калгасам бульбы	Засіласавана калгасамі
1.	Любаньскі	71,9	91,3	94,0	57,8	100,0	2,2	49.	Жлобінскі	20,3	12,5	62,8	69,1	79,2	1,8
2.	Аршанскі	59,8	43,1	100,0	100,0	100,0	3,0	50.	Суражскі	20,1	30,4	90,0	98,2	93,2	1,3
3.	Старадарожскі	55,8	30,8	100,0	36,3	100,0	—	51.	Магілёўскі	20,1	23,4	80,9	72,9	97,1	—
4.	Хойніцкі	50,2	24,4	43,4	47,3	100,0	3,5	52.	Свіцілавіцкі	19,7	32,8	77,4	79,3	53,2	4,8
5.	Чыр.-слабодскі	49,8	66,0	86,7	100,0	100,0	3,8	53.	Чэрвеньскі	19,5	37,3	87,5	91,4	100,0	—
6.	Дубровенскі	48,4	40,6	100,3	98,7	100,0	10,9	54.	Крупскі	19,5	30,3	98,3	60,4	100,0	1,1
7.	Старобінскі	46,4	2,6	99,8	61,8	90,6	4,9	55.	Рагачоўскі	18,9	39,0	85,6	95,1	96,3	2,9
8.	Уваравіцкі	45,2	29,9	84,4	78,9	56,7	8,8	56.	Сенненскі	18,9	14,5	70,4	100,0	61,4	—
9.	Кіраўскі	44,8	19,4	100,0	66,4	100,0	0,06	57.	Полацкі	18,0	18,5	61,8	74,1	100,0	1,2
10.	Слуцкі	44,5	82,5	90,0	88,0	100,0	5,0	58.	Лельчыцкі	17,9	67,7	69,1	60,2	100,0	4,5
11.	Жыткавіцкі	43,4	17,5	12,0	91,7	100,0	24,5	59.	Журавіцкі	17,7	34,6	94,9	89,5	87,7	6,0
12.	Пухавіцкі	43,3	63,0	95,6	93,3	100,0	7,2	60.	Крычаўскі	17,7	14,2	100,5	87,4	77,1	7,6
13.	Бабруйскі	38,9	36,6	96,9	81,7	100,0	11,5	61.	Хоцімскі	17,7	12,5	93,1	89,4	85,9	1,1
14.	Клічаўскі	37,3	25,6	103,2	62,9	95,0	1,2	62.	Асвейскі	17,5	22,2	82,6	69,6	77,4	0,9
15.	Капацкевіцкі	36,7	44,0	102,1	100,0	100,0	1,9	63.	Бярэзінскі	17,4	75,3	100,0	89,2	99,2	3,4
16.	Грэскі	34,7	54,5	86,0	50,9	97,3	2,8	64.	Лагойскі	17,2	16,7	100,1	100,0	100,0	2,0
17.	Добрушскі	32,4	8,3	98,1	52,8	100,0	5,8	65.	Мсціслаўскі	16,8	8,3	100,0	94,4	80,4	19,6
18.	Камарынскі	31,2	71,3	123,3	64,3	100,0	15,8	66.	Сіроцінскі	16,6	51,1	86,5	77,1	74,5	3,4
19.	Брагінскі	31,2	9,1	85,4	44,6	100,0	12,0	67.	Лёзнянскі	16,6	16,3	62,5	91,5	23,5	11,4
20.	Прапойскі	31,1	53,5	100,5	98,9	100,0	3,7	68.	Шклоўскі	16,0	7,1	110,0	81,3	52,6	—
21.	Бягомльскі	30,8	20,3	91,6	100,0	100,0	—	69.	Дзяржынскі	15, 4	78,8	92,2	73,1	100,0	0,4
22.	Парыцкі	30,7	19,1	70,4	73,6	100,0	5,6	70.	Плешчаніцкі	15,0	25,1	88,8	59,2	87,0	—
23.	Тураўскі	30,4	25,1	60,3	100,0	100,0	26,4	71.	Чаўскі	15,0	19,1	89,8	100,0	100,0	9,0
24.	Церахаўскі	30,2	3,5	85,6	87,7	79,3	7,5	72.	Халопеніцкі	14,8	32,0	60,4	92,6	74,3	2,3
25.	Бялыніцкі	29,4	14,1	88,2	86,1	88,5	5,7	73.	Менскі	14,6	55,0	100,1	100,0	100,0	1,0
26.	Кармянскі	29,0	14,6	83,7	89,6	67,8	1,1	74.	Ушацкі	14,4	53,5	100,6	97,3	94,1	7,7
27.	Уздзенскі	28,5	80,5	100,1	100,0	100,0	6,3	75.	Б.-Каталёўскі	13,9	33,0	83,4	67,8	62,5	15,3
28.	Дрыбінскі	28,1	48,0	97,3	100,0	100,0	37,3	76.	Ветрынскі	13,6	12,8	72,0	100,0	98,5	3,0
29.	Даманавіцкі	28,1	15,2	71,9	75,3	75,4	0,9	77.	Гомельскі	13,2	60,4	102,5	63,6	100,0	1,2
30.	Веткаўскі	27,6	7,3	73,7	90,7	98,3	10,5	78.	Клімавіцкі	13,0	22,7	81,6	90,4	63,7	0,8
31.	Капыльскі	26,4	101,7	100,0	97,8	100,0	0,9	79.	Мехаўскі	12,9	15,9	75,2	82,7	71,8	7,4
32.	Чэрыкаўскі	26,4	3,6	91,5	97,8	100,0	—	80.	Ельскі	12,8	23,0	20,6	46,9	79,9	11,7
33.	Мазырскі	26,0	24,2	73,6	33,2	87,2	4,9	81.	Рэчыцкі	12,6	26,1	74,6	33,7	100,0	7,0
34.	Горацкі	24,8	52,3	86,4	87,3	100,0	22,6	82.	Расонскі	12,0	19,9	57,3	35,1	100,0	2,1
35.	Смілавіцкі	24,8	50,3	100,4	69,9	100,0	4,4	83.	Бешанковіцкі	11,5	34,7	101,7	51,0	52,7	—
36.	Петрыкаўскі	24,7	10,7	50,3	94,8	97,3	2,9	84.	Дрысенскі	11,5	13,8	88,4	54,6	26,5	13,2
37.	Заслаўскі	24,0	30,2	93,3	95,5	96,4	3,9	85.	Талачынскі	11,2	61,3	86,3	79,2	53,9	2,0
38.	Нараўлянскі	23,9	45,2	56,2	80,9	100,0	11,1	86.	Лепельскі	10,8	27,1	97,0	99,5	94,9	6,5
39.	Лоеўскі	23,7	85,3	81,7	59,8	100,0	6,5	87.	Чырв.-польскі	10,2	37,9	60,1	84,2	42,1	0,6
40.	Гарадоцкі	23,2	37,5	70,7	73,8	100,0	2,8	88.	Касцюковіцкі	9,4	30,7	71,5	100,0	46,1	9,1
41.	Барысаўскі	23,0	12,9	102,7	37,7	100,0	0,3	89.	Круглянскі	8,1	36,2	85,3	76,4	80,4	1,7
42.	Глускі	22,3	6,4	44,5	64,2	89,3	1,8	90.	Смалявіцкі	7,2	22,2	74,4	96,3	100,0	2,1
43.	Чашніцкі	22,0	51,1	99,1	100,0	97,5	8,6		Па БССР	24,4	30,8	84,9	80,7	87,5	5,1
44.	Асіпавіцкі	21,6	23,4	127,3	72,7	100,0	2,7		Было на 20/VI-36 г.	11,7	29,9	83,6	61,1	68,1	2,9
45.	Віцебскі	21,1	39,2	64,9	91,4	100,0	5,2		Было на 25/VI-35 г.	5,8	30,8	63,0	—	33,0	5,0
46.	Быхаўскі	21,0	21,5	93,5	61,6	98,6	—								
47.	Багушэўскі	20,6	36,7	88,2	53,6	73,7	1,0								
48.	Чачэрскі	20,6	20,9	76,7	62,0	82[illegible]	3,5								

Учотна-статыстычны аддзел НКЗ БССР.

УСЕНАРОДНАЕ АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТА КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР

СТАРАСЦЬ МЯНЕ НЕ ПАЛОХАЕ

Усё, аб чым гаворыцца ў нашай Канстытуцыі — права на гарантаваную працу, адпачынак, матэрыяльнае забеспячэнне ў час хваробы, старасці, страты працаздольнасці — лепшыя паказальнікі клопатаў вялікага **Сталіна** аб шматмільённай сям'і народаў СССР.

Я працую ўжо даўно. Працаваў і ў старыя часы. І вось успамінаецца мне, калі выпадала занялужаць. Не было і да каго звярнуцца за дапамогай, апрача як да сваёй кішэні. Урад і гаспадары ў час хваробы не дапамагалі, а па кішэні не заўсёды магчыма было пракарміцца.

Такое-ж становішча было і са старымі. Згодна існуючых правіл пенсія выдавалася служачым, якія папрацавалі 30—35 год. Размеры яе залежалі ад ранга і службовага становішча чалавека. Вядома, хто нічога не рабіў, атрымліваў вялікую пенсію, а радавы небарака служачы — капейкі або зусім нічога, бо не заўсёды мог даставіць неабходныя дакументы.

Інакш жывецца цяпер. Я стары, мне 63 гады, але адчуваю сябе маладым. Шэсць год атрымліваю узнаўную пенсію і ўсё-ж увесь час працую.

Не гледзячы на мае гады, я дуж і думаю яшчэ нямала папрацаваць на карысць сваёй радзімы.

Аба мне клапоціцца ўрад. Я ездзіў на курорт, некалькі раз накіроўваўся ў лямы адпачынку, а калі мне ўзляцела такая ўвага, то і я павінен адказваць добрасумленнай работай.

Наша Канстытуцыя — сталінская Канстытуцыя і таму кожны працоўны нашай краіны так горача вітае яе і яе стваральніка.

Н. І. ПАЛЬЦАЎ.
Інжынер-будаўнік гароднебульбянага аб'яднання Наркамзема БССР.

ВЕЛІЗАРНЕЙШЫЯ КЛОПАТЫ АБ ПРАЦОЎНЫХ

Кожны артыкул праекта Канстытуцыі аллюстроўвае велізарнейшыя клопаты нашага ўрада аб чалавеку.

Я з вялікім інтарэсам сачу за абмеркаваннем праекта Канстытуцыі прапоўнымі ў цэнтральных і рэспубліканскіх газетах. Праект Канстытуцыі складзен так, што ніводнага слова нельга ні выкінуць ні прыбавіць. Але ўсё-ж мне здаецца, будуць правільныя дапаткі, высоўваемыя радам прапоўных аб неабходнасці арганізацыі саюзнага наркамата асветы і аб ахове праў дзяцей.

Вялікія клопаты аб працоўным чалавеку, якімі прасякнут увесь праект Канстытуцыі, пімат да чаго абавязвае нас, служачых.

Выключная ўвага да кожнага чалавека, які звяртаецца да нас са сваімі патрэбамі, чулыя адносіны да яго, рашучае зжыццё ўсіх выпадкаў бюракратызма ў нашых установах—вось тыя вялікія задачы, якія ставіць перад намі служачымі, Канстытуцыя вялікай краіны Советаў.

АПРЭЛЕВА.
Сакратар Цэнтральнай рабочай паліклінікі.

ПРАМЫЯ ВЫБАРЫ — ВЫНІК СВЯДОМАСЦІ МАС

Я ўважліва прачытаў праект новай Канстытуцыі.

Прачытаўшы, я не зразумеў, як гэта будуць праходзіць прамыя і тайныя выбары на аснове ўсеагульнага галасавання. Мне здавалася, што ў кіруючыя органы могуць папасці людзі, не зусім праверэныя на рабоце. І гэта мяне непакоіла.

Аднак, маё сумненні рассеялі таварышы.

Моцна задумаўся над гэтым пытаннем, прачытаў яшчэ раз Канстытуцыю, нагаварыў з таварышамі — і прышоў да вываду, што ўнясенне гэтага пункта ў праект Канстытуцыі лішні раз падкрэслівае магутнасць нашай бацькаўшчыны і свяломасць прапоўных.

Я ўпэўнен, што ў кіруючыя органы краіны пападуць сапраўды адданыя таварышы, праверэныя на рабоце і аўтарытэтныя ў народных масах.

І гэтыя выбары будуць найдэмакратычнымі выбарамі ў свеце.

Л. Я. ГАРАДЗІНСКІ—
галоўбух шчацінна-шчотачнага аб'яднання.

МАЁ ШЧАСЦЕ

З вялікім захапленнем і радасцю прачытаў я ўвесь праект Канстытуцыі. 7 год майго дзіцячага жыцця прайшлі пры царскім рэжыме. Я яго амаль не памятаю, але мне ніколі не забыць апавяданняў майго 90-гадовага дзядулі пра жудасны царскі рэжым.

Які я шчаслівы, што з'яўляюся грамадзянінам сацыялістычнай бацькаўшчыны і маю такія дэмакратычныя правы, якіх не ведае яшчэ гісторыя чалавецтва!

Я ганаруся нашай новай Канстытуцыяй і яе натхнімелем — таварышам Сталіным.

І. ДЗЮБЧАНКА.
Старшы лабарант Буда-Кашалёўскай кантрольнай насеннай лабараторыі.

НОВАЙ ХВАЛІ ТВОРЧАГА ЎЗДЫМУ АДКАЗВАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ НА ПРАЕКТ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Працоўныя Церахоўскага раёна з пачуццём бязмежнай радасці вывучаюць і абмяркоўваюць праект сталінскай Канстытуцыі.

Калгаснік калгаса «Асветнік» Кушнярэў С. Ф. абяцае працаваць яшчэ лепш.

— Праект новай Канстытуцыі,— гаворыць ён, — небывалы ў гісторыі дакумент, напоўнены сталінскай любоўю і клопатамі аб нас, працоўных.

Ордэнаноска Анна Піханава Каралёнка і яе брыгада абавязаліся адказаць на новую Канстытуцыю высокім ураджаем ільну.

В. ГАНІН.

**
*

Работнікі саюза кааператыі, якія знаходзяцца ў сваім доме адпачынку, абмеркавалі праект новай Канстытуцыі.

«У кожным радку — заявілі адпачываючыя — ясна аллюстроўваюцца клопаты аб жывым чалавеку. Права на працу, на асвету і на адпачынак мае кожны савецкі грамадзянін.

Усё, аб чым пішацца ў сталінскай Канстытуцыі, мы ўсім нутром адчуваем. Здаровыя, сытыя, загарэлыя, вясёлыя, мы праводзім свой заслужаны адпачынак.

Мы абяцаем яшчэ з большай энергіяй і большэвіцкай напорыстасцю, прышоўшы зноў да сябе на прадпрыемствы, ва ўстановы, магазіны, утроіць выкананне сваіх вытворчых заданняў.

Таварааабарот мы пастараемся павялічыць у некалькі разоў. Поплыты працоўных залаволім поўнасцю!».

Ад імя адпачываючых падпісалі: Шламнюў і Лэрнер.

**
*

З выключным уздымам абмяркоўваюць калгаснікі Хоцімшчыны праект новай Канстытуцыі.

У сёлах, на палях сапраўдная ўрачыстасць.

У калгасе «Барэц», Верхне-Ліпаўскага сельсавета, для абмеркавання Канстытуцыі сабралося звыш 150 калгаснікаў.

Абмеркаванне праекта Канстытуцыі выклікала новы творчы ўздым сярод калгаснікаў.

Калгаснікі заявілі, што яны яшчэ больш упарта будуць змагацца за 7—8 мільярдаў пудоў збожжа ў год і яшчэ больш пільна ахоўваць калгасную маёмасць.

САЛАУЕЎ.

**
*

БЕШАНКОВІЧЫ. Праект сталінскай Канстытуцыі выклікаў новую хвалю энтузіязма з боку калгаснікаў, працуючых на лесаўчастку імя Дзяржынскага. Пасля абмеркавання праекта Канстытуцыі была абвешчана стаханаўская пяцідзёнка па вывазцы лесу. Ужо на другі дзень пяцідзёнкі рад калгаснікаў паказалі стаханаўскія ўзоры работы. Калгаснік калгаса «Пралетарская воля» **Шыкневіч Савелій** за дзень на аллегласці 4 кілометры вывез 6.69 кубаметра фанернай бярозы, што складае 300 проц. дзённай нормы. Тав. Шыкневіч зарабіў у гэты дзень 76 руб. 2 кап. Яшчэ больш рэкордную выпрацоўку — 305 проц.—даў калгаснік калгаса імя Блюхера г. **Бурнелька.**

Высокія ўзоры работы паказвае калгаснік калгаса «Новы свет» тав. **Калюў Фёдар.** На аллегласці 10 кілометраў ён за дзень вывез 2.55 кубаметра экспартнага лесу, што складае **256** проц. устаноўленай нормы. Зарабіў ён 65 руб. 56 кап.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.



У часе абедзеннага перапынку група рабочых завода імя Молатава (Мінск) чытае заводскую газету, у якой аменчан матэрыял аб выйгрышах на апошніх тыражах пазык. Фота КАЗЛОВІЧА (Белсаюзфота).

ПАЛІТЫЧНАЯ БЛЫТАНІНА

БЕШАНКОВІЧЫ. На адных з заняткаў гуртка па вывучэнню гісторыі партыі прапагандыст Окунь даваў слухачам-комсамольцам такія ўстаноўкі:

— Легальныя марксісты, — тлумачыць тав. Окунь — выкінулі з марксізма ўсё рэвалюцыйнае і пакінулі ў ім ўсё контррэвалюцыйнае (!?). Пачуўшы такую «трактоўку», комсамольцы аказаліся ў вялікім недауменні. Але тут-жа растлумачылі свайму прапагандысту, што легальныя марксісты фальсіфікавалі рэвалюцыйную сутнасць марксізма, што вучэнне Маркса было і ёсць рэвалюцыйнае вучэнне аб дыктатуры пралетарыята, аб сацыялізме і камунізме.

Па пытанню аб існаванні класаў у нашай краіне ў даны момант гэты «прапагандыст» даваў такое тлумачэнне: класаў у нас існуе два асноўных і адзін прамежны. Да першых двух класаў адносяцца рабочыя і сяляне і да трэцяга класа — недабітая дробная буржуазія. Замест таго, каб растлумачыць гэта пытанне па-сталінску, паказаць усю паслядоўнасць і характар існавання класаў у нас, у СССР, раней і зараз, калі мы знішчылі апошні капіталістычны клас — кулацтва, прапагандыст Окунь уносіць блытаніну.

Аб гэтым факце ведае райком партыі, але чамусьці не палічыў патрэбным заняцца гэтым пытаннем, растлумачыць комсамольцам, у чым заключаюцца памылкі прапагандыста. **Окунь чамусьці да гэтага часу кіруе гуртком.**

АРКАДЗЬЕЎ.

ЧАМУ МАЎЧЫЦЬ ПОЛАЦКІ РАЙКОМ ПАРТЫІ?

У красавіку месяцы ў артыкуле «Рэзерв на паперы» «Звязда» ўказвала рад фактаў аб адсутнасці работы з партыйным рэзервам у Полацкім раёне. З гэтых фактаў відаць было, што райком партыі фармальна аднёсся да выканання пастановы пленума Ленінградскага гаркома партыі і ЦК КП(б)Б аб рабоце з рэзервам.

Але з сігналаў «Звязды» Полацкі райком да гэтага часу не зрабіў вывадаў. Той факт, што ў парадак дня бюро райкома тры разы ўключалася пытанне аб рабоце з рэзервам і ні аднаго разу не абмяркоўвалася, сведчыць, што райком партыі яшчэ і зараз лічыць работу з рэзервам другараднай справай. І работы з рэзервам няма і зараз.

У раёне да гэтага часу не выкаранена практыка, калі вылучаным на кіруючую работу комуністам не аказваецца ніякая дапамога.

Толькі нежаданнем прызнаць свае памылкі, баязню самакрытыкі можна вытлумачыць такія адносіны райкома партыі да важнейшага ўчастка партыйнай работы, да сігналаў «Звязды». Гэты факт сведчыць аб тым, **што райком партыі не вучыць партыйную арганізацыю пабольшэвіцку адносіцца да сігналаў друку, да разгортвання крытыкі і самакрытыкі.**

НА БУДАЎНІЦТВЕ ШКОЛ

ПЕРАЛОМУ ЯШЧЭ НЯМА

Совет Народных Камісараў БССР катэгарычна папярэдзіў усе снабжаючыя арганізацыі, што калі да 23 чэрвеня імі не будзе забяспечана поўная рэалізацыя фондаў будаўнічых матэрыялаў для школьнага будаўніцтва, яны будуць прыцягнуты да судовай адказнасці.

Але снабжаючыя арганізацыі паранейшаму не забяспечваюць будаўніцтва школ матэрыяламі.

На вуліцы Энгельса выкананне плана па жалезабетонных работах не выконваецца толькі з-за адсутнасці жалеза. Жалезабетонныя работы вестыбюля і пляцоўкі лесвічных клетак па плану павінны былі быць закончаны да 20 чэрвеня, але на будаўніцтве і 24 чэрвеня не было ні аднаго грама жалеза. Для пакрыцця даху Белдзяржснаб выдзеліў будаўніцтву усяго 2 тоны дахавага жалеза, замест 4-х.

У выніку недахвату будаўнічых матэрыялаў на будаўніцтве замест адначасовай работы устанаўляецца чаргаваць. Некаторыя работы, як, напрыклад, кладка падлогі, афарбоўка, электраабсталяванне адкладаюцца на потым.

Прараб будаўніцтва тав. Ждан гаворыць, што яны зараз могуць прыступіць да кладкі ўсходаў. Але іх на будоўлі няма. Менскі бетонны завод Белкомунбуда за ўвесь час на будоўлю прывёз толькі 6 усходаў.

— Спецыяльна на гэты завод, — кажа прараб будаўніцтва тав. Ждан, — я паслаў свайго рабочага, які там працуе кожны дзень. Белкомунбуд-жа нашы заказы адкладае.

Побач з недахопам матэрыялаў для школы, менскі чарапічны завод прывёз чарапіцу дрэннай якасці — уся чарапіца ў трэшчынах. А каньковай чарапіцы на будоўлі зусім няма і рабочым прыходзіцца яе рубіць уручную.

Не лепш з рабочай сілай. На будоўлі не хапае 10 цесляроў, 15 падсобных рабочых, 10 штукатураў і 2 сталяры. Кіраўнік Менбуда тав. Голубеў у гэтым напрамку нічога не робіць. Ён толькі гаворыць, што зараз у яго няма рабочых і трэба пачакаць.

Недахоп матэрыялаў, недахоп патрэбнай колькасці рабочых на будоўлі — тармозіць паспяховы ход будаўніцтва.

Але ні Арндт (Беллаяржснаб), ні Майзельс (Белкомунснаб), ні Алесін (Стальзбыт), ні Княжыцкі (Белметалснабзбыт) нічым, вывадаў для сябе не зрабілі. Пастанова СНК БССР засталася ляжаць пад сукном без рэагавання.

Да тэрміну скончання будаўніцтва засталося ўсяго 30 дзён. Тэрмін невялікі. **Да 1 жніўня школа павінна быць закончана.**

І. ЕСЬМАН.

ПАЛЕПШЫЦЬ СНАБЖЭННЕ СПЛАЎШЧЫКАЎ

(Пісьмо рабочых)

На фармовачным пункце Багрышовіцкага лесасплаўучастка (Петрыкаўскі раён) працуюць 200 чалавек рабочых, з іх 50 стаханаўцаў, якія перавыконваюць нормы на 200—250 проц.

Бытавыя ўмовы гэтых рабочых не забяспечваюцца. Ужо на прапяту месяца ў краму ОРС'а (загадчык Хусенскі) кастаўляецца сыры, непрыгодны для спажывання хлеб.

Тлушчы і рыба ў краме мала калі бываюць. Праўда, не так даўно прывезлі бочку рыбы а яна аказалася гнілой. Камісія на чале з фельчарам забараніла яе прадаваць, аб чым быў складзен акт.

На дагавору ОРС павінен завезці для рабочых сплаўучастка на 60 тысяч рублёў промтавараў. Аднак пакуль завезена толькі на 5—6 тысяч. Пастановы партыі і ўрада аб забеспячэнні рабочых-сплаўшчыкаў у петрыкаўскім ОРС'ам не правядзены ў жыццё.

КУЦКО, ПРАКАПЕНКА, КУШНЕР.

Я СТАЎ ЛЕТЧЫКАМ-ІНСТРУКТАРАМ

Мне 21 год. Яшчэ будучы хлапчуком я марыў стаць лётчыкам. Мяне надта цягнула ў паветра. Я не мог роўнадушна глядзець на лятаючую машыну, так і цягнула да яе.

У нашай выдатнай краіне кожны мае ўсе магчымасці шырока развівацца свае здольнасці. Я хацеў стаць лётчыкам — і стаў ім! Два гады працаваў ў якасці слесара на аршанскім чыгуначным вузле і ў той-жа час вучыўся без адрыву ад вытворчасці на курсах пілотаў пры аршанскім аэраклубе. Скончыўшы іх, я быў паслан Цэнтральным советам Асоавіяхіма ў г. Віцебск на курсы інструктараў-лётчыкаў. Так ажыццявілася мая мара. Я стаў лётчыкам-інструктарам. Хіба так лёгка маглі ажыццявіць свае мары нашы бацькі, нашы старэйшыя браты, якія выхоўваліся пры парскім самадзяржаўі? Хіба так лёгка ажыццяўляюцца мары мільёнаў маладых грамадзян у капіталістычных краінах?

Не, там права на вучобу, на развіццё сваіх здольнасцей, на выбар спецыяльнасцей маюць толькі багатыя, «панеькіны сынкі», але ні ў якім разе не рабочыя, не працоўная моладзь.

З вялікай радасцю я чытаў праект новай Канстытуцыі. Канстытуцыя запісвае тое, што фактычна ўжо заваёвана працоўнымі. Толькі ў нас, у нашай краіне, якой кіруе вялікі **Сталін**, магчыма такая, сапраўды дэмакратычная, сапраўды народная Канстытуцыя.

Гэта Канстытуцыя абавязвае нас, лётчыкаў, яшчэ лепш авалодаць авіяцыйнай тэхнікай і не толькі самім авалодаць, але і навучаць другіх гэтай вялікай і важнай справе. Мы разумеем, што вылатна валодаць самалётам у паветры — азначае быць гатовым, у выпадку вайны, даць рашучы адпор ворагам, быць гатовым па абароны нашай любімай радзімы і яе вялікай Канстытуцыі. Мы да гэтага заўсёды гатовы.

М. БАБАРЫКА —
лётчык-інструктар Аршанскага аэраклуба.

Сведка нашых дасягненняў

Калі я скончыла чатыры класы пачатковай школы, маці, каб даць мне магчымасць далей вучыцца, пашла да купчыхі — папячыцельніцы аднаго з пансіёна для сірот прасіць, каб мяне прынялі вучыцца бясплатна.

Гэтая, атлусцеўшая ад гультайства, пані, разам з такімі як і сама, дала мне пагнуць жэрбій на права займацца. Калі ліпня выцягвала чырвоны білецік — лічылі яго прынятым «па ласцы самаго бога».

Мне выпала «шчасце» выцягнуць чырвоны білецік, і я павінна была за гэта некалькі разоў цалаваць евангелле і рукі атлусцеўшых паняў. Калі мая маці пачула, што я прынята ў пансіён, яна ад радасці страціла прытомнасць.

Мне тады было 11 год, але я пра гэтыя здзекі ніколі ў жыцці не забудуся.

Цяпер у мяне расце сын. Ён вучыцца бясплатна. Перад ім шырокая дарога пасля сканчэння дзесяцігодкі ў любую вышэйшую навучальную ўстанову. Толькі трэба мець жаданне вучыцца.

Калі я чытала 121 пункт праекта Канстытуцыі аб праве на асвету, я яшчэ раз адчула вялікія клопаты ўрада аб сваім народзе.

Узяць хаця-бы пункт 109, дзе гаворыцца аб народных судах. Зараз яны будуць выбірацца на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні. Суддзя, якога выберуць масы, будзе адчуваць, што ён адказвае перад народам, яго законам, і будзе чула адносіцца да чалавека.

Уся наша Канстытуцыя — найярчэйшае сведчанне дасягненняў краіны социялізма.

В. МІНКІНА,
бібліятэчны работнік Дома партактыва.

П. Д. ЛЯХАЎ
Сакратар Лепельскага акруговага камітэта КП(б)Б.

НЯСПЫННА ПАВЫШАЦЬ УЗРОВЕНЬ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

Павышэнне палітычнай пільнасці і разгортванне большэвіцкай самакрытыкі ў перыяд праверкі і абмену партыйных дакументаў далі магчымасць нашай арганізацыі ўзняць на новую палітычную ступень партыйнае, гаспадарчае, палітычнае і культурнае жыццё акругі.

Існуючая раскіданасць па сельсоветах і калгасах вялікай колькасці комуністаў і адзіночак тармазіла разгортванне ўнутрыпартыйнай і палітмасавай работы. Комуніст-адзіночка ў большасці быў адарваны ад партыйнага жыцця, бываў толькі на раённых партыйных сходах, якія склікаліся нерэгулярна.

Зараз комуністы - адзіночкі аб'яднаны ў пярвічныя партыйныя арганізацыі, якія выходзяць з вытворча-тэрытарыяльнага прынцыпу. Гэта мерапрыемства значна ажывіла работу партыйных арганізацый, узняла актыўнасць комуністаў.

Усё больш і больш упэўнаецца ў свядомасць парторгаў і работнікаў партыйнага апарату тая ісціна, што партыйны дзень з'яўляецца адной з асноўных форм партыйна-выхаваўчай работы. У пярвічных арганізацыях, як ніколі, пачалі падрыхтоўваць партыйныя дні так, што ў падрыхтоўцы ўдзельнічаюць амаль усе комуністы. Парторг Першай Лепельскай МТС тав. **Рабіновіч** расказвае, што абвестку пра партыйнага схода ведае кожны комуніст задоўга да схода, і ведае як трэба яму рыхтавацца да схода. Пры гэтым парторг сам раіцца з комуністамі, што іх найбольш цікавіць, якія пытанні прадстаўніць на абмеркаванне агульнага схода.

Такая падрыхтоўка да партыйнага дня пяршае інтарэс і актыўнасць комуністаў да партыйных дзён, узнімае ідэйна-палітычную ролю саміх сходаў.

На раённым партыйным сходзе бягомльскай арганізацыі пры абмеркаванні артыкула тав. **Гінало** «Урокі праверкі партыйных дакументаў у Беларускай арганізацыі» выказалася 19 чалавек. Але справа не ў колькасці выказаўшыхся, а ў тым, што большасць выступленняў насіла высокі ідэйна-палітычны характар і была прасякнута канкрэтнымі фактамі работы пярвічных арганізацый, партыйнай вучобы, выхавання і росту людзей. Прыводзіліся асобныя факты прытуплення палітычнай пільнасці. Такое пляшэнне якасці партыйных сходаў мы бачым не толькі ў Бягомлі, а і ў радзе іншых пярвічных арганізацый нашай акругі.

Праўда, ёсць яшчэ асобныя райкомы партыі, якія слаба дапамагаюць пярвічным арганізацыям у правядзенні партыйных дзён. Часта райкомы рэкамендуюць пярвічным арганізацыям надта многа пытанняў да партыйных дзён. І гэта зніжае ініцыятыву саміх пярвічных арганізацый, прыводзіць да непатрэбнага апякунства.

Нямала і такіх выпадкаў, калі багатыя зместам партыйныя сходы канчаюцца вельмі неканкрэтнымі пастановамі. Напрыклад, мсціжская пярвічная партыйная арганізацыя (Бягомльскі раён) пры абмеркаванні рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) аб стаханаўскім руху абмежавалася такой пастановай: «прапрацаваць гэтае рашэнне ва ўсіх калгасах». Ясна, што такое рашэнне нікога ні ў чым не абавязвае, не мабілізуе комуністаў на барацьбу за разгортванне стаханаўскага руху.

Увайшлі ў сістэму самасправаздачы комуністаў. Аднак, ёсць выпадкі, калі індывідуальная справаздача комуніста не дасягае мэты. Напрыклад, лукомская пярвічная партыйная арганізацыя па самасправаздачы комуніста Нікіціна пастанавіла: «Тав. Нікіціну знішчыць усе недахопы».

Такое рашэнне, безумоўна, нічога не дало Нікіціну. Не навучыла яно і астатніх комуністаў.

Больш сур'ёзна партыйныя арганізацыі пачалі падыходзіць і да дачы партыйных даручэнняў комуністам і праверкі іх выканання. Але яшчэ не знішчан фармальны падыход да гэтага важнейшага пытання партыйнага выхавання комуніста. Беразоўская пярвічная арганізацыя прымацавала кандыдата партыі тав. Мяцеліца да комсамольскай арганізацыі калгаса «На варце», і палічыла гэта асноўным партыйным даручэннем, але аказалася, што ў гэтым калгасе ёсць толькі адзін комсамолец...

Ёсць і факты бюракратычнага падыходу да дачы партыйных даручэнняў комуністам. Прыкладам можа служыць рашэнне парткома ўпацкага РВК. У пратаколе пасяджэння парткома сказана: «Слухалі размеркаванне партыйных нагрузак. Пастанавілі: Партыйныя нагрузкі размеркаваць наступным чынам. Тав. Лучына даручыць работу са спачуваючымі, Улопаву — палітмасавую работу, Савіку — сапружаства з калгасамі, Жукаву — насенгасгігу, Церахаву — профработу і т. д.». Тут яшчэ па-старому падыйшлі да вызначэння сталых нагрузак комуністам, прычым зміналі партыйную работу з прафесіянальнай і грамадскай. Такія факты — не выключэнне.

У працэсе абмену партыйных дакументаў у нас вырас новы актыў. На розных ўчастках партыйнай, гаспадарчай, совецкай і культурнай работы вылучана звыш 40 чалавек. Вывучэнне людзей, увага да кожнага жывога чалавека і канкрэтная дапамога комуністу ў яго рабоце ўзнялі якасць кіраўніцтва ўсімі галінамі совецкай, гаспадарчай і культурнай работы.

З паляпшэннем партыйнай работы ўзмацніўся і ўплыў пярвічных арганізацый у масах калгаснікаў. Гэта дало магчымасць згуртаваць калгаснікаў вакол задач, пастаўленых партыяй у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і ўзняцця ўраджайнасці.

**
*

У развіцці социялістычнай сельскай гаспадаркі акруга мае нямала поспехаў. Калгасы ў нас займаюць 96,5 проц. агульнай пасеўнай плошчы, соўгасы яднаюць плошчу ў 3.650 гектараў. З кожным годам усё больш і больш расце тэхнічнае ўзбраенне сельскай гаспадаркі. У акрузе ёсць 6 МТС, з іх адна арганізавана ў гэтым годзе. Трактарны парк акругі налічвае 245 трактараў. Апрача гэтага ў калгасах налічваюцца сотні ільноцерабілак, малатарань, сеялак, жнеярак і іншых сельскагаспадарчых машын.

Палепшылася асваенне сельскагаспадарчых машын. Гэтаму дапамог разгорнуты стаханаўскі рух сярод трактарыстаў.

Прамысловасць акругі расце з кожным годам, галоўным чынам у галіне абслугоўвання сельскай гаспадаркі. У акрузе ў асноўным завершана казапераванне саматужнай прамысловасці.

Валавая прадукцыя прамысловасці ў параўнанні з 1935 годам ўзрасла на 122.4 проц. Амаль у паўтара разы ўзрасла колькасць рабочага класа акругі ў параўнанні з гэтым жа годам.

Расце і комунальна - жыллёвая гаспадарка акругі. У гэтым годзе ў комунальна-жыллёвае будаўніцтва ўкладаецца 1 мільён 601 тысяча 400 рублёў.

Значныя поспехі мае акруга і ў культурным будаўніцтве. На народную асвету ў 1936 годзе адпушчана 9 мільёнаў 694 тысячы 500 рублёў—павелічэнне больш чым у два разы ў параўнанні з мінулым годам. На ахову здароўя ў 1936 годзе вызначана 2 мільёны 704 тысячы 800 рублёў. Рост у параўнанні з мінулым годам на 54 проц.

Аднак усе гэтыя поспехі яшчэ не гавораць аб тым, што намі ўсё ўжо зроблена. У галіне культурнага будаўніцтва нам трэба зрабіць яшчэ многа і асабліва сур'ёзна працаваць па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

Мы разумеем, што зарукай нашых перамог з'яўляецца канкрэтны ўлік абстаноўкі і рамучая барацьба з элементамі зазнайства і самазаспакоенасці.

У сваім выступленні на акруговай партыйнай канферэнцыі тав. **Гінало** з ўсёй вастрынёй указаў нам на рад недахопаў у нашай рабоце. Указаў, што ў нас ёсць элементы самазаспакоенасці. Тав. **Гінало** паставіў перад намі рад практычных задач па далейшаму разгортванню социялістычнага будаўніцтва, па ўмацаванню абароназдольнасці акругі.

Большэвікі Лепельшчыны пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і асабіста тав. **Гінало** з гонарам выканаюць гэтую задачу і выйдуць пераможцамі на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва і ўмацавання абароны нашай социялістычнай радзімы.

ПЯРШЫНСТВА НЕ ЗДАЮЦЬ

Ініцыятыва калгаснікаў Бабруйшчыны знайшла жывы водгук у калгасах Прулокскага сельсовета, Лепельскага раёна.

Каб заваяваць права падпісаць пісьмо аб лепшых людзей, ордэнаносны БССР любімаму і роднаму таварышу **Сталіну**, калгаснікі калгаса імя Крупскай узяліся змагацца за 17 цэнтнераў зернавых з гектара, за 5 цэнтнераў ільнавалакна, і за тое, каб атрымаць з 6 гектараў па 1000 кілаграмаў валакна з кожнага га.

Да пачатку акруговага з'езда советаў калгас скончыў другую праполку ільну і зернавых, скончыў рамонт сельскагаспадарчага ўборачнага інвентару, ачысціў пуні і такі для складання зернавых і сена, скончыў ворыва і баранаванне пару на плошчы 25 гектараў, скончыў дарожнае будаўніцтва, правёў баранаванне і акучванне бульбы, пракапаў на заліўным лугу канаву ў 1.500 метраў і загатаваў торфу пад азімыя 150 тон.

У парадку падрыхтоўкі да свята 11 ліпеня калгаснікі абавязаліся вывезці пад азімыя яшчэ 600 вазоў гною і завезці з МТС 600 цэнтнераў мінеральнага ўгнаення, закончыць будаўніцтва клуба...

К. БАЙДАЧЭНКА.

ЗМАГАЕМСЯ ЗА ГОНАР ПАДПІСАЦЬ ПІСЬМО ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Соўгас «10-годдзе БССР», Любаньскага, раёна, добра арганізаваў догляд за пасевамі. Да 17 чэрвеня поўнасцю закончана праполка канапель на плошчы 560 гектараў. Таксама праведзена праполка яравых збожжавых. Тры разы акучвалі і адзін раз прабаранавалі 21 гектар бульбы. Закончана другая праполка гародніны.

15 чэрвеня соўгас пачаў сенаўборку. За тры дні скасіді 198 гектараў. Лепшыя стаханаўцы-трактарысты—**Новасельскі, Рудзеня, Чорнагораў** і другія выконваюць нормы на трактарнай касілцы на 150—200 процантаў.

З вялікім уздымам рабочыя соўгаса сустрэлі прапанову бабруйскіх калгаснікаў аб пасылцы пісьма таварышу **Сталіну.** Рабочыя заяўляюць: ударным завяршэннем сенаўборкі і падрыхтоўкай да ўборкі ўсяго ўраджаю заваюем права падпісаць пісьмо таварышу **Сталіну!**

С. КАРОТКІН.

НЕСЦІ У МАСЫ ПРАЦОУНЫХ ВЯЛІКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА!


Калектыў БДТ-1 аб сваёй рабоце па абслугоўванню рабочых лесасплаву і калгаснікаў

Тры брыгады Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра выехалі на лесасплаў і далі там 50 спектакляў для дарослых, 5 раніцнікаў для дзяцей, арганізавалі рад вечарынак, масавых гульняў і праглядаў мастацкай самадзейнасці. Брыгады абслужылі звыш 27 тысяч дарослых і каля 1.500 дзяцей.

Рэпертуар брыгад: К. Чорны «Бацькаўшчына», Карнейчук — «Платон Крэчэт» і Гурскі «Сваты». Апрача гэтага былі арганізаваны канцэртныя аддзяленні з харавых беларускіх, рускіх і украінскіх народных песень, танцаў, мастацкага чытання і частушак на мясцовыя тэмы.

Брыгады вярнуліся з паездкі з запасам вельмі каштоўных назіранняў жыцця народных мас БССР. Жывая і творчая сувязь брыгад з народам дала артыстам велізарную і глыбокую зарадку для далейшай работы тэатра па стварэнню сапраўды народных твораў і па рабоце сярод народных мас.

Трэба, каб калектыў тэатра глыбока вывучыў вопыт гэтай паездкі з тым, каб у будучым несці ў гушчу народных мас савецкае мастацтва яшчэ лепш, яшчэ больш арганізавана і тым самым абагаціць і свой вопыт непасрэдная сувязь з народнымі масамі нашай рэспублікі.



Маршруты брыгад артыстаў БДТ-1 на сплаве.

НЕЗАБЫУНАЕ УРАЖАННЕ

Калі мы даведаліся, што нашай брыгадзе прыдзецца выехаць на абслугоўванне лесасплаву не на баржах, як другім двум брыгадам, а на машынах «сухапутным шляхам», мы засмуціліся. Зразумела, што больш цікава было паехаць па такіх рэках як Бярэзіна і Прыпяць, на добра абсталяваных баржах-клубах, чым па пыльных дарогах на грузавіках.

Амаль усю Беларусь прыдзецца праехаць. У маршруце былі вызначаны глухія куткі Магілеўскага, Гомельскага, Віцебскага і Полацкага раёнаў. Кожны дзень прыдзецца іграць у новым пункце, а адлегласць паміж імі—20—35—50—70—120 кілометраў (ад Менска да Чавус).

Няўжо мы здолеем? Прадстаяла 20 дзён цяжкой, стамляючай працы.

І вось сёння гэта ўжо пройдзены этап. І мы не толькі вытрымалі, але — можна цвёрда сказаць — бліскуча выканалі ускладзенае на нас заданне. Зрабілі больш 2 тыс. кілометраў, абслужылі спектаклямі 10.600 глядачоў (рабочых лесасплаву, калгаснікаў). Перавыканалі свой план і ўсе вярнуліся здаровыя, загарэлыя, бадзёрыя ў лазычай вялікім маральным задаволенні.

Цяжка было. Пераезды ў хмарах пылу на пякучым сонцы, начоўкі дзе прыдзецца, часпей за ўсё насаломе, спектаклі ў памяшканнях, дзе замест магчымых 100 чалавек збіралася 300 і больш (вось дзе сапраўды яблыку не было дзе ўпасці!), так што пот градам каціўся як з нашых глядачоў, так і з нас. Ад духаты сіплі галасы. На сцэне павярнуцца не было дзе.

Усё гэта нялёгкія ўмовы, але затое якое маральнае задаволенне, які ўздым ахапляў нас, калі мы ўбачылі сотні гарачых вачэй, глядзеўшых з захапленнем на сцэну, сотні рабочых і калгаснікаў, уважліва лавіўшых кожнае слова са сцэны!

Якое хваляванне ахапляла нас, калі на сцэну пасля сканчэння спектакля ляцелі кветкі, калі пасля двухгадзіннай нашай праграмы (мы давалі «Сваты» Гурскага і вялікі канцэрт) несліся крыкі «яшчэ просім, мала!».

Якое маральнае задаволенне адчувалі мы, калі на сцэну прыходзілі рабочыя лесасплаву і гаварылі нам: «Дзякуем, дзякуем за тое, што ўзнялі наш дух». Ці не прыемна было нам пачуць у прамове сакратара райкома партыі ў Карме: «Вы не ведаеце, якое ажыўленне вы ўнеслі да нас, колькі сёння гутарак і шуму вакол спектакля? Ваша выступленне ў нас ператварылася сапраўды ў культурнае свята».

Гэта дало нам такую зарадку, што стомленасць нашу як рукой здымала і нам хацелася ехаць далей і далей у самыя глухія куткі Беларусі.

А калі зусім нечакана ў такой глушы, як Літвінавічы, Кармянскага раёна, мы спаткаліся са старым большэвіком, другам Уладзіміра Ільіча Леніна тав. Лепяшынскім, наш уздым перайшоў усе межы. Тав. Лепяшынскі наведаў наш спектакль. Ён прышоў паглядзець ці маем мы кантакт са сваім калгасным глядачом і яго ацэнка нашай працы нас вельмі абрадавала. «Вы робіце сапраўды вялікую справу, узорваючы ўпершыню гэту цаліну.

Вы з'яўляецеся піянерамі гэтай справы і гэта мае гістарычнае значэнне».

Тав. Лепяшынскі на другі дзень запрасіў нас да сябе. Ён зусім сівы—белы як лунь, але колькі ў ім бадзёрасці, энтузіязма, якія маладыя ў яго вочы! Мы ўбачылі жывога прафесара Чадава з п'есы «Жыццё кліча» і ўпэўніліся, што большэвікі сапраўды старасці не ведаюць.

Мы надзвычай задаволены сваёй «вылазкай» у глухія куткі Беларусі. Мы ўпэўніліся, якая цудоўная краіна Беларусь, якія незвычайныя месцы нам прыходзілася праязджаць. Мы блізка сустракаліся з рабочымі-стаханаўцамі, з лепшымі калгаснікамі. Мы ўбачылі новую беларускую вёску. Усё гэта дало нам зарадку, новыя думкі, эмоцыі, якія мы ператворым у нашай будучай працы.

Наша партыя і ўрад высока ацанілі нашу працу. Па прыездзе ў Менск мы былі ўсхвалёваны весткай, што Нікалай Фёдаравіч Гікало жадае выслухаць нас аб нашых уражаннях аб паездцы.

Гэта сустрэча з тав. Гікало зрабіла на нас проста незабыўнае ўражанне. Такая зацікаўленасць кіраўніка большэвікоў Беларусі самымі малымі дробязямі нашай працы і быту ў часе паездкі ўсхвалявала нас.

Такая ўвага партыі да нас, работнікаў тэатра, мабілізуе нас на яшчэ больш упартую работу над сабой, каб мы маглі быць сапраўды прадстаўнікамі культуры нашай перадавой ордэнаноснай БССР.

О. ГАЛІНА.
Брыгадзір 1 брыгады.

У лесасплаўшчыкаў Палесся

Мы пачалі свой маршрут з лесаўчастка Сінічына, Бягомльскага раёна, і ехалі на плывучай культбазе ўніз па Бярэзіне да Бабруйска. Потым паехалі на аўтамабілях ў Рагачоў і ўсе ўчасткі рагачоўскай сплаўканторы таксама аб'ездзілі на аўтамабілях. Такім чынам мы зрабілі каля 500 кілометраў.

У склад брыгады ўваходзілі Глебаў, Крыніна, Пікура, Рахленка, Пушкевіч, Гейц, Шаціла, Скачкоўская, Троіцкая, Лідская, скрыпач Бародкін, маніпёр Левін, рыквізітары Зелянкевіч Ф. і Зелянкевіч С.

Гэта паездка прынесла акторам тэатра вельмі многа карыснага. Яны пазнаёміліся са стаханаўцамі палёў і сплаву. Гэта прынясе ім значную карысць пры стварэнні вобразаў новага чалавека-стаханаўца на сцэне. Артысты адчувалі вялікую радасць ад таго, што аб'ездзілі такія цікавыя месцы. Яны бачылі запаведнікі лясоў, баброў, Палікскае возера, вялікія лясы, рэкі і наогул вельмі прыгожыя ландшафты Совецкай Беларусі.

Выезд у самыя аддаленыя глухія куткі ордэнаноснай БССР для мастацкага абслугоўвання рабочых сплаву, лесарубаў і калгаснікаў не быў проста чарговым, звычайным гастрольным падарожжам. Гэты выезд мае зусім іншае значэнне, ён унёс у жыццё і ў творчасць тэатра і ў жыццё кожнага творчага работніка нешта зусім новае, якое пакінула глыбокі і незгладжальны след у сэрцы кожнага з нас. Ужо адзін той факт, што глядачом з'яўляліся рабочыя сплаву, лесарубы і калгаснікі, з якіх большасць ніколі не бачыла тэатра, гаворыць аб тым, што гэты выезд для акцёраў меў асаблівае значэнне.

Асаблівую цікавасць прадстаўлялі спектаклі на адкрытым павергы. На іх збіралася велізарная колькасць глядачоў, многія з іх прыязджалі за 15 кілометраў з аддаленых калгасаў на падводах, на машынах, веласіпедах, прыплывалі на вялікіх дубах і т. д. Навокал наспех зробленай сцэны збіралася шмат дзяцей, першых і самых актыўных памочнікаў у арганізацыі спектакля. Распальваліся вогнішчы, газавыя лямпы, уключалася невялікае святло ад нашай уласнай дынамамашыны і ў гэтым асвятленні іграўся спектакль, які прагна ўспрымаўся глядачамі.

Брыгада абслугоўвала Бярэзінскі і Дняпроўскі басейны. Яна пабывала на 16 лесаўчастках і абслужыла 9 тыс. глядачоў. У рэпертуары была п'еса «Платон Крэчэт» Карнейчука і канцэртнае аддзяленне.

Артысты спачатку сумнявалися у тым, ці дойдзе «Платон Крэчэт» да глядача. Але потым пераканаліся ў тым, што глядачы добра разумеюць п'есу, яе галоўную ідэю і змест. Таксама праверылі ўспрыманне гэтай п'есы і сярод глядачоў цыган, якія ўпершыню бачылі тэатр.

Трэба сказаць, што толькі 50 проц. глядачоў мы маглі задаволіць. Вялікая колькасць людзей не магла папасці на спектакль з прычыны малога памяшкання. У кожным пункце адчувалася вялікая цяга да мастацтва і да культуры. Сплаўшчыкі і калгаснікі вельмі цёпла і любоўна сустракалі нас. Падносілі кветкі, гаварылі прамовы.

У кнігу водгукаў лепшыя стаханаўцы сплаву змяшчалі свае думкі аб спектаклях і выражалі пачуццё ўдзячнасці партыі і ўраду за тое, што ў самыя далёкія мядзвежыя куткі прыязджае тэатр і прыносіць ім культурны адпачынак. Мы не толькі гралі спектакль проста як артысты-прафесіяналы, мы па меры магчымасці вывучалі на месцах бытавыя ўмовы жыцця рабочых, аглядалі інтэрнаты, сталовыя, цікавіліся медыцынскім абслугоўваннем, культработай і прывезлі з сабой вельмі значны матэрыял па становішчу работы бабруйскай і рагачоўскай сплаўных кантор.

У канцэртным аддзяленні мы выконвалі частушкі на мясцовыя тэмы, у якіх адзначалі станоўчыя і атмоўныя бакі жыцця кожнага лесаўчастка, сельсавета, асобных калгасаў і т. д.

Гэтыя частушкі ўспрымаліся з выключным поспехам. Складалі частушкі члены брыгады Скачкоўская, Троіцкая і Рахленка. Вось, напрыклад, некаторыя з частушак:

Лесасплаў наш беларускі
Ў прошлым годзе першым стаў
І за гэта пераходны
Сцяг чырвоны атрымаў.
Прыпеў:
Эх бяроза рана наша слаўная
Ты частушка мая лесасплаўная.
Мелкаводдзе ў гэтым годзе
Нам мяшае працаваць,
Але ўсё-жа мы павінны
Рух стаханаўскі ўзняць.
Многа ёсць людзей тут знатных
Нашых сплаўшчыкаў выдатных,
А хто лепшы з іх у вас,
Гэта Гаўрычак Міхась.

Ці вось некаторыя з частушак аб вельмі дрэнным становішчы інтэрнатаў:

У Змяёўскім інтэрнаце
Ад клапоў не можна жыць,
Калі іх сабраць у кучу,
Можна баржу нагрузіць.
Як у Снуі ў інтэрнаце
Нават цяжка апісаць,
Вельмі дрэннае паветра
Ў супрацьгазе трэба спаць.

Ці вось, напрыклад, аб зрыўшчыках праны.

Вось такіх як Клімашонак
Трэба моцна ў рукі ўзяць
Мы нікому не дазволім
Рух стаханаўскі зрываць.

Аб адсутнасці булак на плытах пелі такія частушкі:

Увесь Бярэзінскі ўчастак
Гэтым адзначаецца,
Што ў дарогу ўсе плыты
Без будан адпраўляюцца.

Ці вось аб п'яніцах:

Наш дзесятнік Праніца
Ледзь настане раніца
Перад працай ў цэнтраспірт
За поўлітрам цягнецца.

Было напісана 200 частушак. Для дзяцей у некаторых пунктах мы арганізоўвалі ігры і танцы. Пасля спектакляў рабілі для моладзі вечарынкі, танцы пры нязменным удзеле нашых музыкантаў, а таксама прыцягвалі гарманістаў-калгаснікаў і сплаўшчыкаў. Правозілі гутаркі аб праекце сталінскай Канстытуцыі і правялі два жалобных мітынгі з прычыны смерці Максіма Горкага.

Мы адчувалі, што нашымі спектаклямі і ўсёй той работай, якую мы праводзілі на месцах, прыносілі вялікую карысць, што пята да мастацтва, да культуры вельмі вялікая. Але на месцах культработа вельмі і вельмі слаба пастаўлена. Апрача таго вельмі дрэнны падбор рабочкомаў і культработнікаў, загадчыкаў клубаў і т. д. Мы думаем, што і надалей трэба практыкаваць такія паездкі і як мага часцей. Мы, артысты тэатра, з вялікай радаслю і гатоўнасцю паедзем і ў наступным годзе ў такую карысную паездку.

Брыгадзір трэцяй брыгады
Л. РАХЛЕНКА.



Артысты першай брыгады БДТ-1 у час сваёй паездкі на сплаў сустрэліся са старым большэвіком тав. П. Лепяшынскім, які адпачывае на сваёй радзіме ў Кармянскім раёне. На адымку: т. Лепешынскі сярод артыстаў.

ІСЦІ У ГУШЧУ КАЛГАСНЫХ МАС

Вялікае дзякуй таварышам артыстам з беларускага тэатра (першай брыгады) за тую асалоду, якую я атрымаў ад іх выступлення на падмостках глухога «клуба» ў такім далёкім куце, як мае роднае сяло Літвінавічы. Мне быў радасным гэты кантакт кваліфікаваных работнікаў сталічнай сцэны з маімі нябачнымі сапраўднага свята культуры землякамі. Іх ініцыятыва — ісці ў гушчу калгасных мас і несці туды святло культуры,—поўніцца вялікімі добрымі вынікамі і мае шансы стаць гістарычна важным момантам.

П. ЛЕПЯШЫНСКІ.

УСЮДЫ СУСТРАКАЛІ РАДАСНА

Першая брыгада БДТ-1 у складзе 13 чалавек 4 чэрвеня выехала на машынах у самыя далёкія куткі Совецкай Беларусі.

Варта было нашым машынам з'явіцца на вуліцах вёсак, як натоўп народу акружаў нас. Усе з вялікай цікавасцю аглядалі нас і нашы машыны, кожную скрыню, чамадан.

Акторы дарэмна не трацяць каштоўнага часу. Хутка распакоўваюцца скрыні, дастаюцца неабходныя рэчы і на пляцоўцы каля былой царквы раздаюцца гукі баяна. Моладзь спачатку слухае, а потым пачынае раскачвацца і хутка ўся лужайка ажыўляецца танцамі.

А ўнутры былой царквы ідуць спешныя прыгатаванні. 2—3 цесляры скалачваюць лаўкі. Развешваецца заслона, дэкарацыі. Нясуцца гукі патэфонаў.

Ужо з глядача і акцёраў ручаямі льецца пот, але нікога гэта не турбуе. Ніколі яшчэ за многа год работы ў тэатры актор не адчуваў такой радасці ў рабоце, як зараз. Ён бачыць, якімі прагнымі вачыма глядзіць на яго глядач, як ловіцца яго кожнае слова.

Прыязджаючы ў пункты, указаныя нам па плану, мы зараз-жа збіралі матэрыял, знаёміліся з мясцовымі ўмовамі вытворчасці і ўсё сабранае адлюстроўвалі ў сваіх частушках...

Тут мы віталі лепшых стаханаўцаў, бічавалі недахопы. Гэта рабіла велізарнейшае ўражанне.

Сустракаў нас глядач вельмі цёпла. Падносілі букеты кветак, кідалі букеты на сцэну, а калі мы адпраўляліся ў далейшую дарогу, кветкамі ўпрыгожвалі машыны.

У Літвінавічах, Кармянскага раёна, у нас была незабыўная сустрэча са старэйшым большэвіком тав. Лепяшынскім.

За час нашай работы на лесасплаве мы сабралі і напісалі 23 частушак на мясцовыя тэмы. Шмат мясцовага матэрыялу ўставілі і ў п'есу.

Добра было-б, каб і другія тэатры Беларусі арганізавалі такія выезды ў далёкія куткі нашай рэспублікі, дзе з нецярплівасцю чакаюць прыезду культурных кваліфікаваных сіл.

Трэба і пісьменнікам і мастакам нашым бліжэй пазнаёміцца з бытам нашай новай калгаснай вёскі.

Артыст І. СЧАНСНОВІЧ.

ВЫДАТНАЯ ПАЕЗДКА

Наша брыгада выехала на Прыпяцкі басейн для абслугоўвання лесасплаўшчыкаў і калгаснікаў з п'есай «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага і канцэртным аддзяленнем. Сцэнічныя пляцоўкі, на якіх нам прыходзілася працаваць, былі самыя рознастайныя: ад невялічкіх клубаў да звычайных калгасных пунь. Аднак гэта ніколькі не знізала якасці нашых выступленняў.

Гэта была выдатная паездка!

Ужо за першыя 8 дзён брыгада абслужыла звыш 3.000 чалавек. Апрача планавых вячэрніх выступленняў мы давалі дзённыя канцэрты для дзяцей і школьнікаў з гутаркамі, гульнямі і развучваннем масавых песень.

Жылі ў «плывучым доме адпачынку» — так называлі мы нашу базу — баржу. Гэта выдатна абсталяваны плывучы клуб лесасплава. Унутры ён афарбован маслянай фарбай пад мрамар, радыёфікаван і добра ўпрыгожан. У нашым распараджэнні — більярд (настольны), патэфон, дробнакаліберныя вінтоўкі і іншыя рэчы для культурнага адпачынку.

Наша напружаная праца кампенсавалася бліскучымі бытавымі ўмовамі, якія былі створаны дзякуючы клопатам ініцыятара гэтага вялікага культурнага мерапрыемства па абслугоўванню лесасплава — Нікалая Фёдаравіча **Гікало.**

Заслужаны артыст рэспублікі
В. І. ВЛАДАМІРСКІ.

15 ДЗЕН НА ЛЕСАСПЛАВЕ

Наша брыгада ў складзе заслужанага артыста рэспублікі В. О. Владамірскага і артыстаў Міронавай, Платонава, Данілава, Ефрамава, Шапко, Гаратова, Панкрат, Гучко, Чарняўскага, Іваўчанка, Маркавец, Рамановіча Н., баяніста Лаўнічука і асвятляльніка Каленіка абслугоўвала лесасплаўшчыкаў і калгаснікаў Прыпяцкага басейна.

За 15 дзён мы далі 17 спектакляў для дарослых і 5 спектакляў для калгаснай дзетвары.

Выступленні артыстаў перамежаваліся з самадзейнасцю, дзе выяўляліся здольныя, даравітыя дзеці. Так, аб адной дзяўчынцы чатырох год і яе трохгадовых падругах (усе яны пелі хорам) мы паведамілі ў Мазыры з мэтай забяспечыць далейшае развіццё гэтых вельмі здольных дзяцей і асабліва маленькай чатырохгадовай «салістк і» з чыстым, гучным голасам і багатым слухам.

Спектаклі адбываліся пры электрычным асвятленні, якое забяспечвалася дынамамашынай брыгады. Для глядачоў гэта была прыемная нечаканасць.

Абслужылі мы больш 8.000 чалавек дарослых і 1.300 дзяцей.

Праграма наша складалася з п'есы «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага і канцэртнага аддзялення: мастацкае чытанне, частушкі на мясцовым матэрыяле і беларускія народныя танцы.

Частушкі, напісаныя на мясцовым матэрыяле, папярэдне добра праверaным, выклікалі заўсёды адабральныя воклічы слухачоў.

Вось узоры шматлікіх частушак. Частушкі аб стаханаўцах:


На гары стаіць дубочак
Салавей на ім пяе,
Гнат Вераксіч на рабоце
Усім прыклад тут дае.
Рэзні, Ваня, на гармошцы
З пералівамі заграй
Лепш за ўсіх на лесавозцы
Дамасевіч тут Гарась.
Уся брыгада ў Гарася
Працай ўзорнаю красна,
І ў Будзёнаўскім калгасе
Першай лічыцца яна.

Частушкі аб лодырах, рвачах, п'яніцах:

«А вось Ваня Павучэнец,
Хто не знае малайца,
Ён «ударнічак» таксама
Толькі з іншага канца.
З ім на пару Голад Ваня,
Як два боты, хоць ты скач,
Кожны скажа, хто не гляне,
Адзін лодыр, другі — рвач.
Лукаш Зухта — вось дзе прыклад
Дзвесце процантаў дае,
Раней піў ён па поўлітра,
А цяпер па літру п'е.

Перавыканаўшы план, брыгада вярнулася з паездкі бадзёрая і радасная, прыняўшы на сябе абавязацельства ў наступны выезд мець спецыяльную праграму для дзяцей і дабіцца яшчэ больш поспехаў на аснове атрыманага вялікага вопыту.

Брыгадзір 2-й брыгады
Б. ПЛАТОНАЎ.



Другая брыгада артыстаў БДТ-1 на лесасплаве ў Прыпяцкім басейне.

СЛОВА ГЛЯДАЧА АБ РАБОЦЕ ТЭАТРА

Дзесяткі водгукаў атрымалі брыгады БДТ-1 ад лесасплаўшчыкаў, калгаснікаў, мясцовых партыйных, комсамольскіх і прафсаюзных арганізацый. Частку з іх мы друкуем ў сённяшнім нумары:

«Дзякую БДТ-1 за пастаноўку «Платон Крэчэт» і канцэрт.

Толькі наша партыя, наш урад, наш любімы таварыш Сталін могуць так клапаціцца аб жывым чалавеку, толькі ў нашай краіне магчыма такое культурнае абслугоўванне самай глыбокай глушы.

Жыць стала лепш, жыць стала весялей.

Брыгадзір МІХАСЬ ГАЎРЫК.
Прыстань Сітчына.

***

«Больш 400 глядачоў, якія прысутнічалі на праглядзе п'есы Гурскага «Сваты» і канцэрта, усхвалёваны і абрадваны тым, што да іх прыехала брыгада артыстаў БДТ-1 са сталіцы нашай ордэнаноснай рэспублікі. Мы рады тым, што прыехалі да нас артысты на самую мяжу з фашысцкай Польшчай і далі надзвычай цікавую пастаноўку.

Шчырае большавіцкае дзякуй усяму калектыву.

Ад імя рабочых і калгаснікаў — старшыня Вароніцкага сельсавета ФЕДАНЕНКА».
Ветрынскі раён.

***

Прагледзеўшы пастаноўку «Сваты» і канцэрт брыгады БДТ-1, рабочы калектыў Фарынаўскага лесасклада і сплаўшчыкаў выносіць шчырую падзяку артыстам. На пастаноўцы прысутнічала 700 чалавек. Мы адзначаем высокае майстэрства ігры акцёраў.

Мы, рабочыя сплаўшчыкі і рабочыя лесасплаву, просім, каб вы часцей прыязджалі да нас.

РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ ФАРЫНАЎСКАГА ЛЕСАСКЛАДА, ВЕТРЫНСКАГА РАЁНА.

***

Чэрыкаўскі РК КП(б)Б выказвае глыбокае задаволенне работай брыгады артыстаў 1-га Беларускага дзяржаўнага тэатра, якая абслугоўвала сплаўшчыкаў, лесарубаў і возчыкаў Чэрыкаўскага раёна.

Выезды артыстаў непасрэдна на рашаючыя ўчасткі сацыялістычнага будаўніцтва трэба надалей практыкаваць не толькі з пункту гледжання культурнага абслугоўвання рабочых, але і як мерапрыемства, неабходнае для творчага росту артыстаў.

Работу артыстаў з БДТ-1 на Лiменскім участку лесасплаву, у прыватнасці артыстаў Галіны, Счансновіча і Антонава, трэба адзначыць, як выдатную.

Сакратар Чэрыкаўскага райкома КП(б)Б
Я. ВЯТРОЎ.

***

Стаханаўцы рабочыя - сплаўшчыкі Бярэзінскага ўчастка, прагледзеўшы п'есу Карнейчука «Платон Крэчэт» у пастаноўцы Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра, надзвычай задаволены спектаклем.

Мы з вялікай напружанасцю сачылі за ігрой акцёраў. У нас надоўга застанецца ў памяці вобраз хірурга Платона Крэчэта (артыст Рахленка).

Толькі дзякуючы партыі і ўраду рабочым-сплаўшчыкам аддаецца такая надзвычайная ўвага.

Мы выносім шчырую падзяку артыстам брыгады БДТ-1 і жадаем у далейшым яшчэ з большай адданасцю працаваць на карысць сацыялізма.

Брыгадзір Едлінскай брыгады Ціт НАГЛЫ,
брыгадзір Жорнаўскай брыгады Даніла ЦІШКЕВІЧ,
стаханаўцы:
Антон ЛАТЫЦЬКА, Супрон НЕСЦЯРОВІЧ, Якаў БУЛОНЧЫК, ХАРЛАКОВІЧ.
Старшыня рабочкома БУРЫ.

НАТА БАБУШКІНА

Трагічны выпадак вырваў з радоў совецкага парашутызма адну з самых маладых і самых смелых яго прадстаўніц.

Наце ледзь споўнілася 20 год (радзілася ў рабочай сям'і ў горадзе Кастраме ў 1916 годзе). У першыя рады совецкага парашутызма яна паставіла сябе ўпартай працай настойлівасцю, велізарнай работай над сабой і няспынным павышэннем сваёй агульнай і авіяцыйнай культуры.

«Работа над сабой — піша яна ў сваіх успамінах — заўсёды здавалася мне галоўнай умовай пасяховасці работы парашутыста, бо толькі гэта выхоўвае ў парашутысце разлік і самаўладанне».

Ната даказала гэта ўсёй сваёй работай, усімі сваімі паводзінамі. Смелая, упартая ў імкненні да пастаўленай мэты, яна з'яўлялася сапраўднай дачкой сваёй вялікай радзімы, прадстаўніком таго маладога, мужнага пакалення гордых сокалаў рэволюцыі, якіх выхавалі і выхоўваюць партыя і ленінскі комсамол.

Ната зрабіла больш 25 парашутных прыжкоў, у тым ліку адзін з вышыні 7.035 метраў і адзін у ваду.

Урадам СССР яна была адзначана высокай узнагародай — ордэнам Чырвонай звязды.

З глыбокім смуткам схіляем свае галовы перад светлай памяццю Наты **Бабушкінай**.

Прэзідыум Цэнтральнага Савета Асоавіяхіма СССР і РСФСР
Цэнтральны аэраклуб СССР імя Косарэва
Майстры парашутызма.

Верная дачка соцыялістычнай радзімы

ЦК ВЛКСМ выражае сваё глыбокае спачуванне ўсім родным і таварышам члена ВЛКСМ ордэнаносьці-парашутысткі **Бабушкінай** Н. В., памёршай ад цяжкіх пашкоджанняў, атрыманых пры парашутным прыжку.

Ната **Бабушкіна** з'яўлялася актыўным членам Цэнтральнага аэраклуба імя А. В. Косарэва і яго парашутнай секцыі.

Ната **Бабушкіна** ў ліку адважнай групы парашутыстак у 1935 годзе ўстанавіла сусветны рэкорд высотнага прыжка з парашутам. Выступаючы неаднаразова на масавых авіяцыйных святах, Ната карысталася заслужанай любоўю як адважная парашутыстка і арганізатар масавага парашутнага спорту.

Ленінскі комсамол будзе захоўваць памяць аб адважнай комсамолцы - парашутыстцы Нане **Бабушкінай** — верным дачцы соцыялістычнай радзімы.

ЦК ВЛКСМ.

ЛЕПШЫЯ СЕЛЬУПАЎНАВАЖАНЫЯ ПА ПАЗЫЦЫ ПРЭМІРАВАНЫ

Цэнтральная камісія садзейнічання ашчадсправе і дзяржкрэдыту пры прэзідыуме ЦВК СССР і Наркамфін СССР прэміравалі лепшых сельупаўнаважаных па пазыцы ў БССР.

Тав. Цэлет П. з калгаса «Чырвоны сцяг», Мазырскага раёна, за стопрацэнтны ахоп падпіскай на пазыку другой пяцігодкі (выпуск 3 года) усіх калгаснікаў, поўны і датэрміновы збор грошай па падпісцы на пазыку з калгаснікаў і ўзорнае абслугоўванне пазыкатрымальнікаў — прэміраван 200 рублямі.

Сельупаўнаважаны Грыневіч Якаў з калгаса імя Гікало, Глускага раёна, за датэрміновы збор пазыковых сродкаў у суме 4.500 руб. і ўзорнае абслугоўванне пазыкатрымальнікаў, Шантур з калгаса «Гігант», Чашніцкага раёна — за датэрміновы і поўны збор грошай у суме 5.015 рублёў і Шутаў з калгаса «Пролетарская перамога», Бялынічскага раёна, за поўны і датэрміновы збор грошай у суме 2.000 рублёў і ўзорнае абслугоўванне пазыкатрымальнікаў, праверку аблігацый па даму ў калгаснікаў — прэміраваны кожны па 150 руб. Заброўскі А. Ф. з калгаса «Іскра Леніна», Чырвонаслабодскага раёна, за поўны і датэрміновы збор грошай у суме 1.600 руб. і ўзорнае абслугоўванне пазыкатрымальнікаў — прэміраван 100 рублямі.

Па гэтых лепшых сельупаўнаважаных павінны раўняцца усе сельупаўнаважаныя па пазыцы ў БССР.

ПЕРАЛЬМАН.

НАРАДА РЭДАКТАРОЎ РАЁННЫХ ГАЗЕТ У МАЗЫРЫ

МАЗЫР, 28 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). 27—28 чэрвеня ў Мазыры адбылася акруговая нарада рэдактараў раённых газет. На нарадзе прысутнічалі таксама асобныя рэдактары шматтыражак і насценных газет, парторгі прадпрыемстваў і калгасаў.

Нарада заслухала даклады рэдактара заманавіцкай раённай газеты тав. Дубравіцкага аб асвятленні газетай пытанняў партыйнага жыцця рэдактара акруговай газеты «Большавік Палесся» тав. Гольшварца аб асвятленні газетай стахановскага руху і рэдактара капаткевіцкай раённай газеты тав. Шатрукова аб рабоце газеты з пісьмамі працоўных. Нарада прайшла ажыўлена. У спрэчках па дакладах выступалі амаль усе ўдзельнікі нарады.



Падрыхтоўка да парада фізкультурнікаў Менска. На здымку: студэнты менскага фізкультурнага тэхнікума трэніруюцца на Усебеларускім стадыёне.
Фота А. БУСЬКО (Белсаюзфото)

ПЕШЫ ПЕРАХОД МАСКВА—МЕНСК—КІЕЎ—МАСКВА

Сёння у 12 гадзін дня ў Менск прыбывае каманда жанак камандзіраў і слухачоў ваеннай акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА імя Сталіна, якая робіць пешы пераход па маршруту Масква — Менск — Кіеў — Масква.

У гутарцы з супрацоўнікам «Звязды» памочнік камандора прабегу па палітычнай частцы тав. К. С. Лагунова паведаміла, што мэта пераходу — узняцце актыўнасці працоўных жанчын у абарончай рабоце і абмен вопытам грамадскай работы жонак камандзіраў складу Чырвонай арміі ў сувязі з падрыхтоўкай да ўсеармейскай нарады жонак камандзіраў, якая адбудзецца восенню бягучага года.

У складзе каманды 27 жанчын ва ўзросце ад 22 да 38 год. Усе яны—актыўныя ўдзельніцы абарончай работы, кожная мае значкі варашылаўскага стралка і «Ударніка Асоавіяхіма».

Удзельніцы пераходу не толькі актыўныя грамадскія працаўніцы, але таксама прыкладныя, адданыя маперы. У большасці з іх па двое, трое дзяцей.

— 5 чэрвеня каманда ўзяла старт з Масквы. Перад выхадам з сталіцы нас павыў нам, наркома абароны СССР армейскі камісар першага ранга тав. Гамарнік.

Галоўную сваю ўвагу, гаворыць тав. Лагунова, — мы адлаем масава-палітычнай рабоце сярод жонак камандзіраў складу РСЧА а таксама сярод калгасніц. Нам асабліва запомнілася наша сустрэча з жонкамі камандзіраў у вёсцы Часлі імя Калініўскага. Дзень нашага прыходу у гэту вёску быў па сутнасці днём уключэння жонак камандзіраў часлі у грамадскую работу. У гонар нашага прыходу жанчыны расчысцілі плошчу каля дамоў начсклада, разбілі клумбы, прывялі плошчу ў прыгожы, культурны выгляд. На сходзе, які адбыўся вечарам, жанчыны далі нам абяцанне тыдня разгарнуць грамадскую і абарончую работу.

У БССР мы па свайму шляху наведалі аршанскі, талачынскі і барысаўскі раёны. У Талачынскім раёне ў калгасе «Новы шлях» мы абмяркоўвалі з калгаснікамі і калгасніцамі праект новай Канстытуцыі СССР. Пасля гэтага далі сваімі сіламі вялікі канцэрт. У Барысаве мы былі 27 чэрвеня. Там мы арганізавалі сход жанчын, у якім прынялі ўдзел звыш 2 тыс. чал. Удзельніцы схода ўзялі на сябе абавязак у найкарацейшы тэрмін здаць нормы на значок «Гатоў да супрацьаветранай і хімічнай абароны».

У Менску мы прабудзем да 4—5 ліпеня. Тут мы правядзем работу сярод жонак камандзіраў вайсковых частак і сярод жонак рабочых і служачых на прадпрыемствах. З Менска наш маршрут ляжыць у напрамку на Кіеў. Агульны праект нашага пераходу 2.450 кіламетраў. Робім мы ў дзень у сярэднім 35—40 кіламетраў. Фізічнае і маральнае становішча ўдзельніц пераходу выдатнае нягледзячы на дрэнную дарогу, вясёлы. Усюды, дзе мы спыняемся, нас сустракаюць з выключнай пяшчотай і гасціннасцю.

С. Г.

НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВЫШЭЙШЫЯ ПЕДАГАГІЧНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ БССР

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб вышэйшай школе Наркомасветы БССР унёс рад змен у правілы прыёму ў вышэйшыя педагагічныя ўстановы рэспублікі.

Усе паступаючыя павінны здаць уступныя экзамены па наступных прадметах: руская мова (пісьмовая работа), граматыка, літаратура; беларуская мова (пісьмовая работа), граматыка і літаратура. На яўрэйскіх і польскіх аддзяленнях правозднача экзамены па рускай мове і па мове, на якой вядзецца выкладанне, палітграмаце, матэматыцы, фізіцы, хіміі. З 1937 года ўводзяцца экзамены па адной з замежных моў (англійскай, нямецкай, французскай).

Дырэктарам вышэйшых педагагічных навучальных устаноў прапанавана безадкладна прыступіць да рамонту вучэбных карпусоў з тым, каб да новага навучальнага года ў кожным вучэбным будынку забяспечыць не менш 4—5 вялікіх аўдыторый для аб'яднаных лекцый. Распрацоўваецца спіс сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ для замацавання за кожнай педагагічнай вышэйшай навучальнай установай у якасці базы вытворчай практыкі студэнтаў тэрмінам не менш чым на 4—5 год.

На бягучы год асігнавана па 500 руб. кожнаму дырэктару навучальнай установы для закупкі літаратуры для асабістага карыстання. Кожны дырэктар пасылаецца ў навуковую камандзіроўку не менш чым на месяц.

ПЕСНІ ДА ЎСЕНАРОДНАГА СВЯТА

Музычны сектар ДВБ выдае дзве новыя песні, прысвечаныя 16-й гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў. Тэксты песень напісаў народны паэт рэспублікі Я. Купала. Музыку да песні «Партызаны» напісаў кампазітар Чуркін, да песні «Беларусі ордэнаносная» — кампазітар Палонскі.

Для зборнага хора з 1.500 спявакоў, які будзе выступаць ў сталіцы ў час усенароднага свята, ужо выдана масавым тыражом «Песня пра Сталіна», тэкст якой напісан украінскім паэтам Рыльскім, музыка — кампазітарам Равуцкім. Таксама выданы дзве народныя песні: «Янка» і «Забадзела ды мая галованька». Гатыя песні пасланы гарадскім і вясковым харавым гуртам. (БЕЛТА).

100 СТЫПЕНДЫЙ ДЛЯ БЫЛЫХ ВЫХАВАНЦАЎ ДЗІЦЯЧЫХ ДАМОЎ

Цэнтральная дзіцячая камісія пры ЦВК БССР выдзеліла 100 спецыяльных стыпендый для былых выхаванцаў дзіцячых дамоў — пяцер вучняў-выдатнікаў вучобы школ фабрычна-заводскага вучнёўства (ФЗВ), тэхнікумаў і рабфакаў. Размер кожнай стыпендыі — 25 руб., якая выдаецца ў дадатак да атрымліваемай стыпендыі ў навучальнай установе.

УДЗЕЛЬНІКІ ВЕЛАПРАБЕГУ ДЗЯРЖЫНСК—КІЕЎ У ГОМЕЛІ

ГОМЕЛЬ, 28 чэрвеня (Спец. кар. «Звязды»). Удзельнікі велапрабегу Дзяржынск — Кіеў прыбылі 27 чэрвеня ў Гомель. Усяго за 27 ездавых гадзін пакрыт 451 кіламетр. Самаадчуванне веласіпедыстаў добрае. Выязджаем ў Чэрнігаў.

ШЭЎЧУК.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Сталінскі гаррайком КП(б)Б і Наркомасветы БССР праводзяць алімпіяду мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў, устаноў, арцелей і навучальных устаноў Сталінскага раёна. Праграй алімпіяды адбудзецца 1, 2, 3, ліпеня. Білеты на алімпіяду атрымаць 29 чэрвеня ў 1 ліпеня ў агульнай канцылярыі Сталінскага гаррайкома.

1 ліпеня, у 6 гадзін вечара, у Доме партактыва (вялікая зала) адбудзецца нарада трыкутнікаў прадпрыемстваў, совенкіх, гандлёвых устаноў і навучальных устаноў Сталінскага раёна.

Сёння, 29 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні райпартгабінета Кагановіцкага РК КП(б)Б (дом Урада, левае крыло, 5 паверх, пакой 501) адбудзецца нарада агітатараў, выкладчыкаў у у час абмену райпартдакументаў.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Памяшканне Белдзяржтэатра | Гастролі харкаўскага дзяржаўнага украінскага тэатра імя Т. Г. ШЭЎЧЭНКА (б. Верасаль)

29 чэрвеня КАРПЕНКА-КАРЫЙ

МАРТЫН БОРУЛЯ.

Пачатак у 8 г. веч.

«ЧЫРВОНАЯ ВОРКА» | ГУЛЬНЯ Ў ЛЮБОЎ
«ПРОЛЕТАРЫЙ» | Е Г І Т
«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» | П Е Т Э Р
„СПАРТАК" | ПАЭТ І ЦАР

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР | СЁННЯ, 29 чэрвеня, на экране прыгодніцкі гукавы фільм

ДЖУЛЬБАРС

Звыш праграмы—кінохроніка „ПІОНЕРЫЯ".

Памяшканне ЦДТ-1 | Ад 5 ліпеня гастролі Чэсноўскага дзяржаўнага цэнтральнага тэатра рабочай моладзі

5 ліпеня А. Бруштэйн ПРОДОЛЖЕНИ СЛ ДУЕТ
6 ліпеня А. Астроўскі БЕДНОСТЬ НЕ ПОРОК
7 ліпеня А. Арбузаў ДАЛЬНЯЯ ДОРОГА

Папярэдні продаж білетаў з 1 ліпеня. Падрабязнасці ў афішах.

ДЗЯРЖЦЫРК (Сад „Профінтэрн") Тэл. 25-085 і 24-171.

СЁННЯ, 29 чэрвеня, вялікае цыркавое прадстаўленне ў 3-х аддзяленнях.

У праграме—лепшыя совецкія і замежныя нумары і атракцыёны.

КАСА—з 12 да 2 і з 5 да 10 гадзін вечара

30 чэрвеня — вялікі дзіцячы РАНІЦНІК па зменшаных цэнах. Дзеці да 6 год пры дарослых праходзяць дармова.

Каса — з 11 гадзін раніцы.

ЗАВОЧНЫ СЕКТАР

Беларускага дзяржаўнага універсітэта

працягвае НАБОР

СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ на 1936—37 навучальны год на матэматычны, фізічны і біялагічны факультэты.

На завочны сектар БДУ прымаюцца настаўнікі і іншыя асобы, якія маюць асвету ў аб'ёме поўнай сярэдняй школы.

Прыём заяў да 1 жніўня.
Прыёмовыя іспыты — з 1 да 20 жніўня.
Даведкі аб прыёме можна атрымаць па адрасу:

Менск, Універсітэцкі гарадок, завочны сектар БДУ.

ЗАВОЧНЫ СЕКТАР БДУ.

Віцебскі дзяржаўны мастацкі тэхнікум

абвяшчае НАБОР студэнтаў

на 1936—37 навучальны год.

ПРЫЁМНЫЯ ІСПЫТЫ з 20 па 29 ЖНІЎНЯ. Паступаючыя павінны трымаць іспыты па беларускай і рускай мовах, матэматыцы, грамадазнаўству і геаграфіі ў аб'ёме праграмы 7 класаў сярэдняй школы, а таксама спецыяльныя іспыты па мастацкіх дысцыплінах: рысунак з натуры і кампазіцыі.

Да заявы аб паступленні трэба прыкласці наступныя дакументы (у арыгіналах): а) метрыку, б) атэстат аб скончанні 7 класаў сярэдняй школы, в) даведку аб прыгоднасці здароўя да мастацкай спецыяльнасці, г) дзве завераныя з уласнаручным подпісам фотакарткі і паштовых марак на 40 кап. для адказу.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ з 10 ЧЭРВЕНЯ да 20 ЖНІЎНЯ ЎКЛЮЧНА.

Заявы і дакументы дасылаюцца з дакладным указаннем адраса падаючага заяву.

Прыбываючыя павінны мець пашпарт. Прынятыя ў тэхнікум забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй у залежнасці ад паспяховасці.

Курс навучання — 4 гады. Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 35 год.

Адрас тэхнікума: Віцебск, Валадарская вул., № 3/5, Мастацкі тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Клімавіцкі зоатэхнічны эхнікум

са спецыялізацыяй буйной рагатай жывёлы

абвяшчае АСЕННІ НАБОР студэнтаў

на 1 курс у колькасці 90 чалавек.

У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 16 да 30 год, якія маюць асвету за сямігадовую школу і вытрымаюць іспыты па фізіцы, матэматыцы, беларускай мове і літаратуры, грамадазнаўству і фізічнай геаграфіі.

Паступаючыя павінны прадставіць дакументы:
а) заяву, 2 фотакарткі, паштовых марак на 40 кап;
б) пасведчанне аб адукацыі (у арыгінале);
в) метрычную даведку;
г) даведку аб здароўі ад дзяржаўных лекавых устаноў;
д) аўтабіяграфію, засведчаную сельсоветам.

Пачатак заняткаў — з 1 верасня.

Студэнты забяспечваюцца дыферэнцыяванай стыпендыяй — ад 65 да 110 руб., інтэрнатам, пральняй, сталовай.

Жадаючыя трымаюць іспыты падаюць вышэй пералічаныя дакументы на імя тэхнікума па адрасу:

г. Клімавічы, зоатэхнікум.

УВАГА. Прыязджаючыя павінны мець пашпарт.

ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМА.

ПРАВІЛЫ

прыёму ў цэнтральную калгасную жывёлагадоўчую школу БССР на 1936—37 навучальны год.

г. Копысь, Аршанскі раён, БССР.

1. Цэнтральная калгасная школа ставіць сваёй мэтай падрыхтаваць нізавых спецыялістаў сацыялістычнай жывёлагадоўлі — калгасных тэхнікаў-жывёлаводаў.

2. Тэрмін навучання 12 месяцаў (10 мес. тэарэтычнай вучобы і 2 месяцы вытворчай практыкі).

3. Паступаючыя ў школу павінны адпавядаць наступным запатрабаванням: мець не менш адной года кіруючай працы ў калгасе — заг. фермы, брыгадзіра, члена праўлення, старшыні калгаса.

У школу прымаюцца лепшыя калгаснікі і калгасніцы, перадавікі вытворчасці, якія маюць лепшыя паказальнікі ў рабоце.

4. Агульная асвета паступаючых ў школу павінна быць не ніжэй 4-х груп сямігадовай або ведаў у гатым аб'ёме.

5. Узрост паступаючых — ад 21 да 40 год; інваліднасць, якая не перашкаджае разумовай працы, перашкодай для паступлення ў ЦКЖШ не служыць.

6. Адбор кандыдатаў у Цэнтральную калгасную жывёлагадоўчую школу праводзіцца спецыяльна створанай пры райза адборачнай камісіяй з прадстаўнікоў РК КП(б)Б, РК КСМ райза і МТС. Адказнасць за выкананне развёрсткі ускладаецца персанальна на заг. райза.

7. Адбор кандыдатур ў школу адборачныя камісіі павінны закончыць да 5 жніўня, у складзе адобраных павінна быць не менш 50 проц. жанчын.

8. Усе камандзіруемыя на вучобу павінны да 5 жніўня здаць справы і з'явіцца на іспыты ў ЦКЖШ. Мець пры сабе наступныя дакументы: пастанову агульнага схода калгаса аб пасылцы на вучобу;
камандзіроўку райза;
даведку аб стане здароўя;
даведку аб асвеце.

Іспыты ў ЦКЖШ адбудуцца з 5 да 15 жніўня, падатак заняткаў — 16 жніўня.

9. У ЦКЖШ слухачы забяспечваюцца інтэрнатам, пасцельнымі прыладамі, падручнікамі і стыпендыяй ад 120 да 150 руб. у залежнасці ад паспяховасці.

Выдаткі на праезд у школу аплачваюцца за рахунак камандзіруемых ім калгасаў.

Скончыўшыя школу накіроўваюцца на работу ў тыя раёны, з якіх камандзіраваны і працуюць не менш двух год.

Камандзіраваныя на вучобу павінны мець пры сабе бяспошу, пашпарт (абавязкова) і ўчотна-вайсковы білет.

НАРКАМЗЕМ БССР.

ІНСТЫТУТ МАС ВАГА З ВОЧНЫМ ГА НАВУЧАННЯ П РТАКТЫВА пры ЦК КП(б)Б

Слухайце радыёлекцыі завочнай партвучобы ў ЛІПЕНІ 1936 г.

праз Менскую радыёстанцыю РВ-10 і трансляцыйныя радыёвузлы БССР.

Час перадачы: штодзённа (апрача 6, 12, 18, 24, 30 чысла) з 19 г. 30 м. да 20 г. 30 м.

ГІСТОРЫЯ ВКП(б)

Папулярны курс лекцый.

3/VII — «Партыя ў рэканструкцыйны перыяд». Лекцыя першая. (Партыя ад XV да XVI з'езда і барацьба з правым апартунізмам, як галоўная небяспека).

8/VII — «Партыя ў рэканструкцыйны перыяд». Лекцыя другая. (Партыя ў перыяд паміж XVI і XVII з'ездамі і разгром права-«лявацкага» двурушніцкага блока).

13/VII — «Партыя ў рэканструкцыйны перыяд». Лекцыя трацяя. (XVII з'езд ВКП(б) — з'езд пераможцаў. Разгром і ліквідацыя астаткаў антыленінскіх груповак... ...ма павышэння большавіцкай пільнасці).

Цыкл лекцый

па ПАСЛЯК... ГІСТ... МУ ПЕРЫЯДУ ГІСТОРЫІ ВКП(б)

17, 23, 26 ліпеня — «Як большавікі арганізавалі перамогу Вялікай пралетарскай рэволюцыі». (3 лекцыі).

28 ліпеня — «Партыя ў перыяд пралетарскай дыктатуры» (кастрычнік 1917 г. — лета 1918 г.).

У жніўні і верасні будуць праданы наступныя лекцыі гэтага цыклу: «Барацьба партыі з «левымі» камуністамі і троцкістамі ў перыяд Брэста».

«Партыя — правадыр і арганізатар перамог на франтах грамадзянскай вайны».

«Партыя ў барацьбе з троцкістамі і групай дэмакратычнага цэнтралізма ў гады ваеннага комунізма».

«Пераход к НЭП'у і барацьба партыі з троцкістамі і «рабочай апазіцыяй».

«Партыя ў адноўленчы перыяд і барацьба з троцкістамі у 1923—24 гг.».

«Партыя пры пераходзе ад адноўленчага к рэканструкцыйнаму перыяду і барацьба з новай апазіцыяй» (Каменеў—Зіноўеў) і троцкісцка-зіноўеўскім антыпартыйным блокам (1925—1927 гг.)». (2 лекцыі).

«Партыя ў рэканструкцыйны перыяд». Лекцыя першая. (Партыя ад XV к XVI з'езду і барацьба з правым апартунізмам, як галоўная небяспекай).

«Партыя ў рэканструкцыйны перыяд». Лекцыя другая. Партыя ў перыяд паміж XVI і XVII з'ездамі і разгром права-«лявацкага» двурушніцкага блока).

«Партыя ў рэканструкцыйны перыяд». Лекцыя трацяя. (XVII з'езд ВКП(б) — з'езд пераможцаў. Разгром і ліквідацыя астаткаў антыленінскіх груповак і задача павышэння большавіцкай пільнасці).

ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ

Цыкл лекцый па эканоміцы пераходнага перыяда.

19/VII — «Марксісцка-ленінскае вучанне аб пераходным перыядзе ад капіталізма к комунізму».

25/VII — «Кастрычніцкая рэволюцыя, як пачатак сусветнай сацыялістычнай рэволюцыі. Экспрапрыяцыя экспрапрыятараў і аўладанне камандным вышынямі».

29/VII — «Совецкая сістэма, як самая прагрэсіўная сістэма гаспадаркі».

Цыкл лекцый па пытаннях

Канстытуцыі СССР—7, 10, 15 і 20-га ліпеня.

ПЫТАННІ ПРАГРАМЫ І СТАТУТА ВКП(б)

4 ліпеня — «Як будуецца партыя бальшавікоў».

9 ліпеня — «Статут ВКП(б) аб абавязках членаў партыі».

ПЫТАННІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

5 і 27 ліпеня.

ПЫТАННІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ

2, 17 і 22 ліпеня.

Лекцыі завочнай партвучобы праз радыёстанцыю імя Комінтарна (з Масквы) слухайце з 18 г. 30 м. да 19 г. 30 м. па наступнаму раскладу:

ГІСТОРЫЯ ВКП(б) — 5, 10 і 15 ліпеня.
ПЫТАННІ ПРАГРАМЫ І СТАТУТА ВКП(б) — 16, 20 і 26 ліпеня.
ПАЛІТЭКАНОМІЯ — 9, 19 і 29 ліпеня.
БЯГУЧАЯ ПАЛІТЫКА ПАРТЫІ І СУРАДА — 3, 13 і 23 ліпеня.

ТАВАРЫШЫ!

Пытанні, якія ўзніклі ў сувязі з праслуханай вамі лекцыяй ці праца...ай вучэбнай літаратуры, а таксама водгукі і заўвагі аб лекцыях, накіроўвайце па адрасу:

г. Менск, вул. К. Маркса, 47/36, БІМЗО.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Усебеларускі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў

абвяшчае НАБОР студэнтаў на 1 курс.

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-тэхнолагаў для керамічнай прамысловасці.

Курс навучання — 4 гады.

Для паступлення ў тэхнікум патрэбна прадставіць наступныя дакументы: пасведчанне аб скончанні 7 класаў сярэдняй школы, метрычны выпіс, даведку аб стане здароўя аўтабіяграфію даве фотакарткі і на 40 кап паштовых марак. Усе залічаныя студэнты забяспечваюцца інтэрнатам, аб кватэрай. Стыпендыя выдаецца па паспяховасці.

Уступныя іспыты — па матэматыцы, фізіцы, хіміі, гісторыі і беларускай мове — пачнуцца з 16 жніўня г. г.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі тэхнікума да 15 жніўня, з 9 г. раніцы да 4 г. дня, за выключэннем выходных дзён — 6, 12, 18, 24 і 30.

Аб прыездзе на іспыты будзе паведамлена пожнаму ў пісьмовую.

Адрас: Гомель, Ветравая 50.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ШТО ТАКОЕ КАНСЕРВЫ „ТУШАНАЕ МЯСА"

Кансервы «Тушанае мяса» маюць вельмі добрую якасць у параўнанні са свежым мясам: яны дазваляюць падрыхтаваць пажыўнае і смачнае мясное блюда літаральна на працягу некалькіх мінут.

Вось чаму гэтыя кансервы атрымалі шырокае распаўсюджанне як у хатнім быце, так і асабліва для ўжывання ў час рознага роду экскурсій, прагулак, на дачы, на паляванні і т. п.

Разам з тым кансервы ўладаюць тымі-ж ўласцівасцямі, што і свежае мяса: адна банка кансерваў вагой у 338 грам мае 670—680 калорый, што гаворыць аб іх высокай пажыўнасці.

Кансервы «Тушанае мяса» вырабляюцца на заводах Галоўкансерва з лепшага добраякаснага мяса здаровых і ўпітаных кароў, валоў ці свіней.

Апрача 230 грам тушанага мяса і тлустасці ў склад кансерваў уваходзіць 100 грам бульёна (або жэле), які стварыўся з навару. Пры вырабу мяса ачышчаецца ад касцей, храшчоў, сухажылля, буйнай плёнкі і кровеносных сасудаў. Усе працэсы вырабу мяса працякаюць пад няспынным кантролем хіміка-бактэрыялагічных лабараторый, на рынак не выпускаецца ні адна банка, якая-б не прайшла праверкі правільнасці вагі і спецыяльнай тэрмастатнай вытрымкі (г. зн. адбракоўкі гатовай прадукцыі шляхам яе выпрабаванняў на працягу 10 дзён пры тэмпературы да 39 градусаў).

З кансерваў згатаўляецца рад блюд: мясны суп атрымліваецца пры апусканні маючагася ў банцы ў любы гароднінны або крупяны адвар, другое блюда згатаўляецца так: змешваецца маючаеся ў банцы з вараной бульбай або капустай і дабаўляецца адпаведны соус.

САЮЗКАНСЕРВЗБЫТ.

Інстытут чырвонай прафесуры літаратуры

АБВЯШЧАЕ НАБОР слухачоў

на 1936-37 навучальны год.

Умовы набору апублікаваны ў „Правде" ад 22 мая г. г.

Прыём заяў да 10 ліпеня г. г.

Слухачы забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй.

Адрас: Масква, Крымская плошча, 2.

ІКП літаратуры.

Рэдакцыі газеты „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ МАШЫНІСТКІ

на дзённую і вячэрнюю работу.

Звяртацца па адрасу: Совецкая 63, 3-ці паверх, у сакратарыят.

Тыраж 90.550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—148.